

ЯК НЕ ДАПУСЦІЦЬ ХАТНЯЙ ТЫРАНІІ

Сямейная газета

РЫЖСКАЯ «ЛІХАМАНКА»

13




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

4 МАЯ 2023 г. ЧАЦВЕР № 84 (29964)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Вікторыя ВЕРЫНА, намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення рэгулявання зямельных адносін, землеўпарадкавання і зямельнага кадастру Дзяржкаммаёмасці:**

*«Сутнасць Адзінага рэестра пустых дамоў заключаецца ў адлюстраванні ў рэжыме рэальнага часу інфармацыі аб такіх аб'ектах. Акрамя таго, вядзенне рэестра садзейнічае знаходжанню ўласніка. Напрыклад, калі ўласнік не знаходзіцца ў тым населеным пункце, а выехаў за мяжу. Грамадзяне могуць даведацца, што гэты дом можа быць прызнаны пустым, і звярнуцца з апавяшчэннем аб планах на яго выкарыстанне. Акрамя таго, рэестр дае магчымасць праз інтэрнэт глядзець дамы, якія цяпер прадаюцца. Калі кагосьці зацікавіць такі дом, можна звярнуцца ў сельскі або раённы камітэт і ўдакладніць усе нюансы: якім чынам прадаецца дом — шляхам прамога продажу або праз аўкцыён, на ўдзел у якім можна заявіцца. З пачатку года прададзена больш за 110 дамоў. Яшчэ змяшчаецца інфармацыя аб 150 дамах. Усяго ў Адзіным рэестры знаходзіцца каля 8,5 тысячы дамоў, у дачыненні да якіх цяпер ідзе работа».*

# Са святам, дарагія нашы!



Фота БелТА.



**З надыходзячым Днём Перамогі ў Гродне павіншавалі ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны Валянціну БАРАНАВУ і Сямёна ПАДАФЕДАВА. Іх чакалі аркестр, кветкі, падарункі і шчырыя віншаванні з 9 Мая. Да кожнага з шанаваных жыхароў Гродна і вобласці ў перадсвяточныя дні накіроўваюцца прадстаўнікі ўлады, грамадскіх аб'яднанняў. Нашых герояў наведвае моладзь.**

З палёў

## У ЧЫМ СІЛА, «ЛІПАЎЦЫ»?

**На Віцебшчыне падыходзіць да завяршэння сяўба ранніх яравых культур: аграрыі справіліся з задачай на 99 працэнтаў. На чарзе ў гаспадарак паўночнага рэгіёна — кукуруза, рапс, аднагадовыя травы. Завяршыць вясновыя палявыя работы працаўнікі плануюць да 20 мая.**

СТАР. 3



Механізатар Максім КУРАШ.

Генералы і радавыя Перамогі

## ЁН УЗНАЧАЛІЎ ПЕРШЫ БОЙ У ГІСТОРЫІ ПАРТЫЗАНСКАГА РУХУ

**У Пінскім раёне ўстановяць бюст легендарнага партызанскага камбрыга Васіля Каржа**



**Помнік герою вайны, адважнаму партызанскаму камандзіру Васілю Захаравічу Каржу неўзабаве з'явіцца ў Пінскім раёне. Корж — ураджэнец Мінскай вобласці, доўгі час там працаваў, але яго ваенная біяграфія звязаная найперш з Піншчынай. Тут ён сфарміраваў адзін з першых у краіне партызанскіх атрадаў, тут партызаны далі першы бой ворагу.**

СТАР. 4

## КОРАТКА

- **Дзяржаўных узнагарод удастоены 56 прадстаўнікоў розных сфер дзейнасці.**
- «Белтэхагляд» у красавіку выдаў больш за 160 тысяч дазволаў на ўдзел у дарожным руху.
- **Цэнтр патрыятычнага выхавання моладзі на сродкі ад суботніка плануюць пабудаваць за тры гады.**

ISSN 1990 — 763X

23084

9 771990 763008

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

Ідзе падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе

Мы абяцаем нясумнае лета з любімай газетай

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

Парламенцкі дзённік

# КАБ ЖЫЦЬ У ЧЫСТАЙ КРАІНЕ

**Учора ў Баранавічах прайшло пасяджэнне экспертна-кансультатыўнага савета пры Прэзідыуме Савета Рэспублікі на чале са Старшынёй Наталляй КАЧАНАВАЙ.**



Перад пачаткам работы ўдзельнікі мерапрыемства ўсклалі кветкі да помніка воінам і партызанам, якія вызвалялі Баранавічы ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Хвілінай маўчання напярэдадні Дня Перамогі 9 Мая яны ўшанавалі памяць тых, хто ратаваў краіну ў гады ваеннага ліхалецця.

На пасяджэнні экспертна-кансультатыўнага савета абмяркоўваліся пытанні арганізацыі работы з адходамі, іх раздзельнага збору, перапрацоўкі і далейшага выкарыстання.

У Баранавічах дэпутаты наведалі пункт прыёму (нарыхтоўкі) другасных матэрыяльных рэсурсаў і сартавальна-перагрузачную станцыю. Удзельнікам сустрэчы паказалі, як арганізаваны збор адходаў ад насельніцтва, як яны перапрацоўваюцца і якая прадукцыя ствараецца з атрыманай сыравіны.

Пасяджэнне было арганізавана менавіта ў Баранавічах, бо, калі ў 2019-м Прэзідэнт разглядаў тут выкананне рашэння па паскораным развіцці гарадоў з насельніцтвам 80 тысяч плюс, размова зайшла ў тым ліку і пра работу з адходамі. Была пастаўлена задача на прыкладзе Баранавічаў зрабіць так, каб гэтым досведам скарысталася ўся краіна.

— Абыходжанне з адходамі закранае ўсе рэгіёны краіны і кожнага чалавека паасобку. У краіне шмат робіцца ў дадзенай галіне: ад экалагічнай бяспекі, якая ўжо стала нацыянальным брэндам, і прававых механізмаў да грамадскіх слуханняў і грамадскага кантролю. У грамадстве існуе экакультура, аднак трэба зрабіць яшчэ шмат, каб раздзельны збор увайшоў у жыццё кожнага.

**Да 2035 года ў Беларусі павінна перапрацоўвацца 90 % адходаў (у выглядзе другасных матэрыяльных рэсурсаў і сыравіны для кампаставання), для чаго ў краіне будуць створаны 30 рэгіянальных комплексаў па абыходжанні з адходамі (цяпер працуюць восем). Смеццевых палігонаў застанецца толькі 30 на ўсю краіну (пакуль іх 161).**

На пасяджэнні падкрэслілі, што мерапрыемствы па абыходжанні з адходамі павінны быць рэнтабельнымі. У гэтым плане ўжо сёння з перапрацаваных адходаў вырабляецца мноства прадукцыі, накшталт новых палімерных вырабаў, вулічнай пліткі і пакрыццяў, актыўна асвойваецца тэхналогія кампаставання і вырабу РДФ-паліва са смецця.

**Ірына СІДАРОК, фота аўтара.**

*Пра што яшчэ гаварылі на пасяджэнні ў Баранавічах — чытайце ў заўтрашнім нумары «Звязды».*

Актуальна

# З УЛІКАМ НОВЫХ ВЫКЛІКАЎ І ПАГРОЗ

## Навуковая і экспертная супольнасць абмеркавала абноўленую Канцэпцыю нацыянальнай бяспекі

**Тэматычны круглы стол адбыўся на базе Навукова-даследчага інстытута Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь. Асноўныя змяненні Канцэпцыі нацбяспекі, а таксама падыходы да ацэнкі стану нацыянальнай бяспекі ў ваеннай сферы былі абмеркаваны пад кіраўніцтвам начальніка Генеральнага штаба Узброеных Сіл — першага намесніка міністра абароны Віктара ГУЛЕВІЧА і першага намесніка дзяржаўнага сакратара Савета бяспекі Паўла МУРАВЕЙКІ.**

Як нагадаў першы намеснік дзяржсакратара Савета бяспекі, 20 лютага бягучага года на пасяджэнні дадзенага ведамства кіраўнік дзяржавы адобрыў новую рэдакцыю Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі і, перш чым гэты дакумент будзе ўнесены на зацвярджэнне Усебеларускім народным сходам, даў даручэнне правесці масавае абмеркаванне дакумента ў працоўных калектывах, сярод экспертнай супольнасці, на дыялогавых пляцоўках з удзелам навукоўцаў-прадстаўніцтва.

«Канцэпцыя нацыянальнай бяспекі як дакумент зведала мноства змяненняў, — адзначыў Павел Муравейка. — Папярэдні дакумент за дзесяць гадоў свайго існавання фактычна дасягнуў гарызонту сваёй дзейнасці і меў патрэбу ў дэталізацыі ў часткі, якая датычыцца ўдакладнення асноўных кірункаў і тэндэнцый развіцця сучаснага свету, выклікаў, рызык і пагроз, якія за гэтыя дзесяць гадоў узніклі. Натуральна, трэба было высвятліць месца і ролю нашай краіны, як яна будзе адаптавацца да ўсіх тых змен. Усе пералічаныя тэндэнцыі паўплывалі на распрацоўку прынцыпова новага дакумента».

У абноўленай Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі можна вылучыць пяць блокаў навацый, якія закладзены ў яе змест. «Па-першае, удакладнены паняційны апарат, — звярнуў увагу першы намеснік дзяржаўнага сакратара Савета бяспекі. — Мы ўпершыню за апошні час падышлі да таго, што бяспека не можа існаваць у адрыве ад чагосьці. Закладзена, што нацыянальная бяспека — гэта стан абароненасці нацыянальных інтарэсаў дзяржавы дзеля яе гарманічнага і дынамічнага развіцця. Галоўны пасыл — бяспека для развіцця. Акрамя таго, дадзена вызначэнне фактычна ўсім відам бяспекі, з якіх сёння складаецца нацыянальная бяспека».

Другое нававядзенне, адлюстраванае ў дакуменце, — у Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі ацэнены сучасны стан сістэмы міжнародных адносін, вызначаны асноўныя тэндэнцыі развіцця сучаснага свету, выяўлена, як гэтыя тэндэнцыі ўплываюць на нашу краіну і як яны трансфармуюцца ў рызыкі, выклікі і пагрозы ўласнай бяспецы. Усе фактары і ўмовы, якія ствараюць тыя ці іншыя праблемы для функцыянавання дзяржавы, улічаны.

Наступны аспект, што знайшоў адлюстраванне ў абноўленым дакуменце, — удасканаленне і змяненне нацыянальных інтарэсаў, а менавіта іх адаптацыя пад сучасныя ўмовы. Па словах Паўла Муравейкі, усе яны скарэкціраваны і ўдакладнены, зыходзячы са змен сучаснай абстаноўкі. «Акрамя таго, вызначаны некаторыя новыя нацыянальныя інтарэсы, — удакладніў ён. — У прыватнасці, у якасці стратэгічнага нацыянальнага інтарэсу вызначана ўсямерная абарона народа Беларусі як унікальнай гістарычнай супольнасці і адзінага носьбіта суверэнітэта і народаўладдзя ў краіне».

У абноўленай Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі вызначаны сучасныя выклікі, рызыкі, пагрозы, сфарміраваны парадак рэагавання на іх, удакладнены алгарытм функцыянавання сістэмы нацыянальнай бяспекі. Яшчэ адна навацыя — у сучасным дакуменце замест васьмі стала дзевяць відаў бяспекі. «Выклікі, якія сфармуляваў COVID-19, з'яўленне вялікай колькасці біялагічных лабараторый па ўсім свеце, спробы ствараць пэўныя геномы ўздзеяння на асобныя нацыі прымусілі нас разглядаць біялагічную бяспеку як адзін з элементаў нацыянальнай бяспекі ў цэлым», — звярнуў увагу першы намеснік дзяржаўнага сакратара Савета бяспекі.

Пасля абмеркавання праекта Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі прысутныя абмяняліся думкамі наконт некаторых пытанняў у галіне ваеннай бяспекі. «Мы бачым, што робіцца вакол граніцы нашай дзяржавы, — вызначыў актуальнасць размовы **намеснік начальніка Генеральнага штаба Узброеных Сіл па навуковай рабоце Віктар ТУМАР.** — Беспрэцэдэнтная мілітарызацыя Еўропы, ваенна-палітычная нестабільнасць на Блізкім Усходзе, пэўныя працэсы, блізкія да ўзнікнення ваеннага канфлікту ў Ціхаакіянскім рэгіёне, — мы бачым, што ўвесь свет цяпер знаходзіцца або ў стане вайны, вядзення ўзброеных дзеянняў, або стаіць на парозе ад гэтага. Ваенная бяспека цяпер як ніколі важная для ўмацавання міру ў нашай дзяржаве. Сувязь ваеннай бяспекі са сферай нацыянальнай бяспекі і іншымі сферамі прасочваецца праз індыкатары нацыянальнай бяспекі. Што датычыцца сферы ваеннай бяспекі, наша канцэпцыя сарыентавана на мерапрыемствы стратэгічнага стрымлівання — недапушчэння ваеннага канфлікту на нашай зямлі. Цяпер дадзенае пытанне вельмі актуальнае і важнае для нашай дзяржавы».

**Вераніка КАНЮТА.**

Па сутнасці

# МАРШАМ ПЕРАМОГІ



**У сэрцы кожнага беларуса гучаць зразумелыя і пераможныя: «Пол-Еўропы, прошагали пол-Земли. Этот день мы приближали, как могли...» Калі гучаць высокія ноты Дня Перамогі, то ўвесь свет разумее. Гэта марш Жыцця. Марш Памяці. Марш удзячных нашчадкаў Пераможцаў. Ідуць тыя, хто павінен быў застацца ў мінулым. Тыя, хто павінен быў ператварыцца ў дым Асвенцыма і Майданэка. Тыя, хто павінен быў, згодна з педантычна вылічанымі лічбамі гебельсаў, застацца жывым рабом. Тыя, хто павінен быў па планах менгеляў стаць біялагічным матэрыялам. Не. Мільёны разоў — не. Да апошняй кроплі крыві мы адстойвалі сваё права «людзьмі звацца». Бо менавіта гэтая бітва за далейшае наша жыццё — Вялікая Айчынная — акумулявала ў сабе ўсе стагоддзі нашага маршу да Дзяржаўнасці і да Незалежнасці. Увесь боль слоў: «Равуць вятры, грымяць грамы, пыл засціць вочы нам, і ўсё ж, і ўсё ж мы дойдзем, дойдзем мы да Беларусі...»**

Беларусь памятае Вялікую Айчынную вайну. Памятае сваю вялікую гісторыю. Перад вачыма, нібы кінаплёнка, асада драпежнікамі Слуцка. Ужо тады нашы продкі выратавалі Еўропу ад, кажучы сучаснай мовай, міграцыйнага крызісу. Перад вачыма, нібы кінаплёнка, пераможны кліч Грунвальда. Тады хапіла рыцарам жалезных крыжоў аж на паўтысячагоддзя розуму не ісці са зброяй далей Буга. Перад вачыма, нібы кінаплёнка, бітва пад Лясной з самай лепшай еўрапейскай армадай Карла XII. Менавіта гэтая перамога стала маці вядомай Палтаўскай бітвы. І ў памяці застаўся сэнс выказвання: «як швед пад Палтавай». А што да тых найлепшых еўрапейскіх армад, дык іх чарговы крах памятаюць воды Бярэзіны. Шмат вады ўцякло. А «C'est la berezina» французы альбо швейцарцы крычаць, калі ім дрэнна альбо балюча.

І зноў хвалі ўжо беларускага Буга праглынулі моц і веліч непераможных арыйцаў. «Я — Брэст, вяду бой» рэхам праляцела па ўсёй ужо скоранай Еўропе. Па тым барэлеўскім садзе, што схіліў ажно да зямлі свае галіны перад катамі і акупантамі. А мы яшчэ здзіўляемся, чаму чэхі, палякі ды французы так лакейнічаюць перад англасаксам. Акупацыя і ўдзел у абозах «дранг нах остэн» для іх — звыклая справа. Таму зносяць абеліскі. Сорамна і агідна. У іх не было і не будзе такой Перамогі.

Бо брамай неўміручасці стаў Брэст. Бо ў знішчаным Мінску стралялі руіны. Бо за дымам Буйніцкага поля можна было разгледзець абаронцаў Сталінграда. Бо «ўсёпаглынальная» палеская багна праглынула дзясяткі эшалонаў «вызваліцеляў», а ад «цёплага» прыёму лепельска-расонскіх партызанаў у холад кідала генералаў і фельдмаршалаў нават у гітлераўскім бункеры. Бо з няскоранага: «Я — Брэст, вяду бой» і пачыналася кароткая — нібы стрэл — заява: «Перамога!»

Але вайна — гэта не бравада. Гэта бухенвальдскі набат. Гэта пахаванкі ў руках мільёнаў маці і жонак. Гэта тысячы хатынскіх хлявоў па ўсёй тэрыторыі нашай краіны. Гэта калі не дайшоў да сваёй мэты кожны трэці. Гэта пустыя калыскі. І вочы, мокрыя ад жалю. Гэта трэба ўцяміць, зразумець, пражыць. Каб больш не было ганебных старонак. Каб не было тых, хто кідае камяні ў сваіх франтавікоў, у мемарыялы і абеліскі. У Памяць.

Памятаеце гэтыя «маршы»? Перагрэтых на сонцы і «закіпелых» ад інтэрнэт-тэхналогій. Сорам дый толькі: не пасароміліся назваццца «пераможцамі». Ды пад палотнамі калабарантаў-карнікаў. Тых, што палілі і гвалтавалі, тых, што лізалі абцасы акупантаў... Ды толькі за тое, што для іх Дзень Перамогі — гэта дзень жалобы, за імі нават пыл трэба было змыць з нашых праспектаў. Партызанскага, Пераможцаў, Незалежнасці.

Менавіта ўжо ў гэтых назвах адлюстраваны наш код дзяржаўнасці. Перамога, нібы пупавіна з роднай зямлёй, знітавала ўсе нашы перамогі. Над акупантамі і захопнікамі, над радыяцыяй і санкцыямі. Над усімі ворагамі і іспытамі гісторыі. Некалі Купала спытаў: «А хто там ідзе?» Больш ніхто не спытае, бо ведаюць: ідзём мы — беларусы. Мірныя. Але калі спатрэбіцца зноў адстойваць права «людзьмі звацца», то не сумнявайцеся, што пойдзем у атаку — усім народам.

Каб была магчымасць выйсці на праспект Незалежнасці, прыйсці з кветкамі на плошчу Перамогі, каб патанцаваць на пляцоўках уздоўж праспекта Пераможцаў. Ды проста дыхаць. Яны, 1418 дзён і начэй у акопах, у рукапашнай, у атаках, праз балоты, па мінных палях, пад дротам, кароткімі перабежкамі пад бамбёжкамі, па-пластунску... Дайшлі! Каб з гонарам і ўдзячнасцю іх нашчадкі стаялі каля мартэнаўскіх печаў і на спартыўных пляцоўках, уставалі да світання, каб засяваць шырокія палі на добры ўраджай. Каб жыць — за кожнага трэцяга. Каб пад мірным небам пад белымі крыламі прайсці дарогай жыцця.

Рушым далей. Нясцінным Маршам Перамогі.

**Яўген ПУСТАВОЙ.**

**Члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокія спачуванні Шульгану Канстанціну Канстанцінавічу, міністру сувязі і інфарматызацыі, у сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю МАЦІ.**

# У ЧЫМ СІЛА, «ЛІПАЎЦЫ»?

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

У бягучым сезоне віцебскім хлебаробам неабходна асвоіць 314 тысяч гектараў пасяўных плошчаў. З іх ужо засеялі 125 тысяч га збожжавых і зернебабовых, 22 тысячы — рапсу, 5,2 тысячы гектараў кукурузы, аднагадовых траў і лёну — 8,3 і 10,5 тысячы гектараў адпаведна. На палях паўночнага рэгіёна кіпіць работа ад відна да відна: сельскагаспадарчыя планы вобласці выконвае каля шасці тысяч адзінак тэхнікі. І нядзіўна, што праз месяц пасля старту пасяўной кампаніі амаль усе раёны вобласці ўжо залажылі залатую аснову будучага ўраджаю.


Механізатар Павел ДАШКЕВІЧ.

У ліку іх — і паўночны Віцебскі раён. Тут, у сельскагаспадарчым унітарным прадпрыемстве «Ліпаўцы», зернебабовыя культуры поўнасцю адсеялі некалькі дзён таму. Следам — 100 гектараў рапсу, цяпер механізатары шчыруюць на палях, адведзеных пад аднагадовыя травы.

«У кароткія тэрміны асвоілі 731 гектар плошчаў, адведзеных пад раннія яравыя культуры. Скончылі сеяць рапс, на 700 гектарах пасеем травы, яшчэ 950 адведзена пад падсеў. Пад царыцу палёў — кукурузу — падрыхтавалі 1700 гектараў. Акцэнт робім не толькі на хлебнае золата, але і на зялёны корм, пашыраем плошчы. Галоўнае — забяспечыць гаспадарку сваімі кармамі, тады і мяса будзе, і малако», — расказвае **галоўны аграном СУП «Ліпаўцы» Юлія ПРАВАЛІНСКАЯ.**

Цікавы эксперымент з зялёнай масай правялі тут у мінулым сезоне. На 86 гектарах віцебскія аграрыі пасадзілі нехарактэрную для паўночнага клімату шматгадовую культуру — казлятнік з сямейства бабовых. Працэс сяўбы яго быў не з лёгкіх, аднак сёлета поле радуе сваімі ўсходамі, пры добрым раскладзе казлятніку можна сабраць па 250 цэнтнераў з гектара. І работнікі «Ліпаўцоў» у поспех свой вераць.

Адзін з тых, хто стаяў каля вытокаў гэтага эксперыменту і іншых складаных палявых работ, — вопытны механізатар з 15-гадовым стажам Максім Кураш. Без прафільнай адукацыі, але з моцнай любоўю да тэхнікі і сельскай гаспадаркі, ён пачаў свой шлях у прафесію ў Верхнядзвінскім раёне ў мясцовым калгасе. А пасля адказнага спецыяліста запрасілі ў Прыдзвінскі край. Разам з жонкай Вольгай, дачушкай Дар'яй і сынам Кірылам Курашы рванулі ў «Ліпаўцы».

Пяты год Максім Мікалаевіч ездзіць на «Беларусе» па палях гаспадаркі, задзейнічаны на ўсіх этапах падрыхтоўкі глебы. Майстэрства і ўпартасць у падыходзе да любога працэсу кіраўніцтва цэніць высока, таму і даверае механізатару самыя адказныя ўчасткі. Спадарожніца па жыцці Вольга Ігараўна падтрымлівае мужа не толькі дома, але і на рабоце: яна таксама працуе ў «Ліпаўцах» на пасадзе вядучага ветурача. На ніву сельскай гаспадаркі Максім Мікалаевіч ступіў следам за бацькам, а яго дзеці, асабліва малодшая Даша, таксама вельмі любяць пракаціцца з бацькам у трактары. Цяпер ва ўсіх аграрыяў гарачая пара: з 6 гадзін раніцы і да 8 вечара не змаўкае тэхніка, гадзіна на адпачынак і абед — і зноў клічуць чорныя разоры. І хоць вольнага часу ў Кураша няшмат, аднак знаходзіць ён у сваім напружаным графіку без выхадных месца для рыбалкі, якая з'яўляецца для мужчыны душэўнай аддушынай.

Знаёмячыся з людзьмі, на якіх трымаецца гаспадарка, заўважаеш, што моц невялікіх «Ліпаўцоў» заключаецца ў сямейных дынастыях, якія працуюць тут. Павел Дашкевіч у СУП — навічок, ён пераехаў у раён зусім нядаўна разам з жонкай Галінай. Бацька і дзед Дашкевіча былі ў Верхнядзвінскім раёне вядомымі механізатарамі, таму ў братоў Паўла і Леаніда развfamiliarжаннем наконт прафесіі і быць не магло.

Чатыры гады таму ў гаспадарку пад Віцебскам з сям'ёй прыехаў старэйшы брат Леанід, а цяпер яны шчыруюць за стырном удвух. Ад брата Павел пераняў не толькі сакрэты работы на зямлі, але і тэхніку — чырвонага «Беларуса» 3022, на якім падрыхтоўвае глебу сёння. Жонка Галіна ўладкавалася на ферму аператарам машыннага даення, плячом у плячо сужэнцы пішуць свой працоўны летапіс і наладжваюць быт на новым месцы. Ім, як і Максіму Курашу, прадпрыемства выдзеліла дом з камфортнымі ўмовамі і агародам, пры пераездзе кіраўніцтва падтрымала людзей і фінансава. Нягледзячы на цяжкі графік і стомленасць, Дашкевічы трымаюць сваю гаспадарку: карову, курэй. «А як па-іншаму жыць вяскоўцам? Да працы звыклыя, і на рабоце паспеем пасеяць, і дома агарод абрабіць. Вясновыя клопаты для людзей ад зямлі адналькавыя», — усміхаецца Павел Ільіч.

І такіх прыкладаў, калі ў гаспадарцы працуе ўся сям'я, у «Ліпаўцоў» нямала. А што яшчэ трэба для таго, каб работа была ў радасць? Падтрымка, вера і любоў... да сельскай гаспадаркі, вядома.

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА, фота аўтара.**

Гучная справа

## 47 ГАДОЎ ПАЗБАЎЛЕННЯ ВОЛІ НА ТРАІХ

### Абвешчаны прыгаворы Пуцілу, Рудзіку і Пратасевічу

**Мінскім абласным судом Сцяпан Пуціла прыгавораны да 20 гадоў, Ян Рудзік — да 19 гадоў пазбаўлення волі са штрафам у памеры 1 тысячы базавых велічынь (Br37 тысяч) кожнаму, паведаміла БелТА.**



Пуціла і Рудзік прызнаны вінаватымі ў арганізацыі на тэрыторыі Беларусі масавых беспарадкаў, групавых дзеянняў, якія груба парушаюць грамадскі парадак, публічных заклiках да захопу дзяржаўнай улады, учынення акта тэрарызму і іншых дзеянняў, накіраваных на прычыненне шкоды нацыянальнай бяспецы Беларусі, паклёпе і публічнай абразе Прэзідэнта. Акрамя таго, яны прызнаны вінаватымі ў змове з мэтай захопу дзяржаўнай улады ў Беларусі неканстытуцыйным шляхам і іншых злачынствах. У сувязі з тым, што абвінавачаныя Пуціла і Рудзік схаваліся ад правасуддзя, крымінальная справа ў дачыненні да іх разгледжана ў парадку спецыяльнага вядзення. Пры гэтым выкананы агульныя правілы судовага разбору.

Паводле абвінавачання, фігуранты, сярод якіх таксама Раман Пратасевіч, у розны час з 2020 года, знаходзячыся пераважна ў Польшчы, выконваючы агульны план змовы з мэтай захопу дзяржаўнай улады ў Беларусі неканстытуцыйным шляхам, рэалізоўваючы ролі і задачы ўстойлівай групы, якую яны ўзначальваюць, публікавалі ў сетках каналаў NEXTA (экстрэмісцкае фарміраванне са структурнымі падраздзяленнямі, якія ў яго ўваходзяць, на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь прызнана тэрарыстычнай арганізацыяй) і «Беларусь галаўнога мозга» (канал прызнаны экстрэмісцкім) інфармацыйныя матэрыялы, якія маюць дэструктыўныя мэты. Акрамя таго, абвінавачаныя заклікалі пратэсна настроеных грамадзян учыняць акты тэрарызму.

Мінскім абласным судом адміністратар дэструктыўных тэлеграм-каналаў Раман Пратасевіч прыгавораны да васьмі гадоў пазбаўлення волі ў калоніі ўзмоцненага рэжыму. Такое рашэнне прынята з улікам аказанага абвінавачаным садзейнічання ў расследаванні злачынстваў. Пратасевіч прызнаны вінаватым у арганізацыі на тэрыторыі Беларусі масавых беспарадкаў, групавых дзеянняў, якія груба парушаюць грамадскі парадак, публічных заклiках да захопу дзяржаўнай улады, учынення акта тэрарызму, іншых дзеянняў, накіраваных на прычыненне шкоды нацыянальнай бяспецы Беларусі, кіраўніцтве экстрэмісцкім фарміраваннем, паклёпе ў адносінах да Прэзідэнта і яго публічнай абразе.

Як растлумачыла журналістам пракурор аддзела Генеральнай пракуратуры Наталля Сакалова, на сёння мера стрымлівання ў выглядзе хатняга арышту ў дачыненні да абвінавачанага пакінута без змянення. «Пасля ўступлення прыгавору ў законную сілу ў часткі выканання прыгавору ён будзе ўзяты пад варту і адбываць пакаранне ў папраўчай калоніі ўзмоцненага рэжыму», — адзначыла дзяржабвінаваўца. Пры гэтым у тэрмін пакарання будзе залічаны час утрымання Пратасевіча пад дамашнім арыштам — з 22 чэрвеня 2021 года да дня ўступлення прыгавору ў законную сілу з разліку адпаведнасці двух дзён дамашняга арышту аднаму дню пазбаўлення волі. Таксама ўлічаць і тэрмін утрымання пад вартай — з 23 мая 2021-га да 21 чэрвеня таго ж года (адзін дзень утрымання пад вартай будзе адпавядаць паўтара дням пазбаўлення волі).

Іск па справе адміністратараў дэструктыўных тэлеграм-каналаў Рамана Пратасевіча, Сцяпана Пуцілы і Яна Рудзіка згодна з рэзалютыўнай часткай прыгавору будзе перададзены на разгляд у парадку грамадзянскага судаводства. «Суд прызнаў права на задавальненне грамадзянскага іску намесніка генеральнага пракурора аб кампенсацыі ўрону, прычыненага злачынствамі гэтых людзей, і перадаў пытанне аб яго памерах на разгляд у парадку грамадзянскага судаводства», — адзначыла Наталля Сакалова.

Прыгавор у законную сілу не ўступіў і можа быць абскарджаны і апратэставаны ў апеляцыйным парадку.

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Украіна спрабавала нанесці ўдар па Крамлю

Пра гэта паведаміла ТАСС са спасылкай на прэс-службу прэзідэнта Расіі. У ноч на 3 мая Кіеў здзейсніў спробу нанесці ўдар па Крамлю. Адзначаецца, што два беспілотнікі былі накіраваны на крамлёўскую рэзідэнцыю прэзідэнта Расіі. Расійскім ваенным і спецслужбам удалося вывесці са строю БПЛА. У выніку ўкраінскага нападзення пацярпелых няма, кіраўнік дзяржавы таксама не пацярпеў і працягвае працаваць у звычайным рэжыме. У прэс-службе паведамілі, што Крэмль расцэньвае дадзеную атаку як сплананую тэрарыстычную акцыю і замах на кіраўніка дзяржавы напярэдадні Дня Перамогі, парада 9 Мая, на якім плануецца прысутнасць і замежных гасцей. Інцыдэнт, аднак, не паўплывае на планы Крамля — парад на Краснай плошчы 9 Мая адбудзецца, заявіў прэс-сакратар прэзідэнта Дзмітрый Пяскоў. Пуцін возьме ўдзел ва ўрачыстасцях. Масква пакідае за сабой права адказаць Кіеву на спробу ўдару «дзе і калі палічыць патрэбным». Тым часам улады расійскай сталіцы забаранілі палёты беспілотнікаў у горадзе. Удакладняецца, што забарона ўводзіцца на палёты ўсіх БПЛА за выключэннем тых, якія неабходныя для дзяржаўных патрэб. Адпаведны пратакол падпісаны падчас пасяджэння апершатаба Масквы. Мэр горада Сяргей Сабянін падкрэсліў, што мэтай такіх мер стане прадухіленне незаконнага выкарыстання беспілотнікаў, якія могуць ускладніць работу праваахоўнікаў.

### У Германіі зафіксавана небывалае падзенне продажаў прадуктаў харчавання



Рэальны абарот прадпрыемстваў рознічнага гандлю прадуктамі харчавання ў Германіі скараціўся ў сакавіку на 10,3 працэнта ў параўнанні з аналагічным перыядам 2021-га, што стала самым сур'ёзным падзеннем за 30 гадоў назіранняў дадзенага паказчыка. Асноўнай прычынай такога падзення Федэральнае статыстычнае ведамства ФРГ назвала істотны рост цэн на прадукты, паведаміла ТАСС. Там таксама падлічылі, што рознічныя продажы прадуктаў аказаліся на 5,6 працэнта ніжэй за значэнні сакавіка 2019-га, гэта значыць перадпандэмійнага перыяду. У ведамстве звярнулі ўвагу, што цэны на прадукты харчавання «раслі ў тры разы хутчэй» за агульную інфляцыю і ўжо павялічыліся на 22,3 працэнта ў гадавым выражэнні. Паводле даных федэральнай службы статыстыкі ФРГ, сярэднегадавы тэмп прыросту цэн вытворцаў у ФРГ, зафіксаваны ў 2022 годзе, склаў 33 працэнты, што стала самым высокім яго значэннем за ўсю гісторыю назіранняў з 1949 года.

### Еўрапол паведаміў аб затрыманні каля 300 чалавек па справе аб наркагандлі ў даркнэце




Паліцэйская служба ЕС (Еўрапол) у каардынацыі з дзевяццю краінамі правяла аперацыю супраць нелегальнага рынку Monopoly Market у даркнэце і затрымала 288 чалавек, якія падазраюцца ў продажы або куплі наркотыкаў, гаворыцца ў заяве службы, апублікаванай на яе сайце. Яны былі затрыманы ў Еўропе, ЗША і Бразіліі. Канфіскавана больш за 50,8 мільёна еўра наяўнымі і ў форме віртуальнай валюты, 117 адзінак агнястрэльнай зброі і 850 кілаграмаў наркотыкаў, сярод якіх былі амфетаміны, какаін, МДМА і ЛСД. Паліцыя атрымала доступ да пашыранага спіса пакупнікоў, з-за чаго цяпер тысячы кліентаў па ўсім свеце могуць трапіць пад следства. Аперацыя пад кодавым імем SpecTor складалася з серыі дзеянняў у дзевяці краінах.

# ЁН УЗНАЧАЛІЎ ПЕРШЫ БОЙ У ГІСТОРЫІ ПАРТЫЗАНСКАГА РУХУ

## Аддаць належнае герою

**Начальнік аддзела ідэалагічнай работы і па справах моладзі Пінскага райвыканкама Юрый БУШЫК** назваў кампанію па вырабе помніка актам гістарычнай справядлівасці:

— Мы хочам аддаць належнае не толькі Герою Савецкага Саюза, партызанскаму генералу, але і ўсяму партызанскаму руху. Бюст Васілю Каржу плануецца ўстанавіць у вёсцы Ставок. Праз яе праходзіць дарога Пінск — Лагішын, дзе 28 чэрвеня 1941 года адбыўся першы партызанскі бой. У дзень рэспубліканскага суботніка работнікі ААТ «Ставокскае» і Ставокскага сельвыканкама добраўпарадкавалі пляцоўку, дзе будзе ўстаноўлены помнік. Гэта сквер каля сельвыканкама.

Работы па вырабе помніка знаходзяцца на фінальнай стадыі. Над праектам шчыравалі супрацоўнікі Пінскага райвыканкама і прадпрыемства Беларускага саюза мастакоў «Мастацтва». Сродкі традыцыйна сабралі талакой, свой унёсак зрабілі калектывы прадпрыемстваў і арганізацый раёна. Эскіз прайшоў усе неабходныя ўзгадненні. Над увасабленнем вобраза героя працуюць брэсцкія скульптары, сужэнцы Павел і Алеся Герасіменкі. За аснову ўзяты фотаздымак, зроблены падчас парада партызанскага парада ў ліпені 1944 года.

Васіля Каржа ніколі не забывалі на Піншчыне, яго імя носіць адна з вуліц Пінска, гімназія № 3 горада (раней сярэдняя школа № 13), у навучальнай установе з 1976 года дзейнічае музей баявой славы. Экспазіцыя аб партызанскай біяграфіі героя ёсць у школьным музеі, багаты матэрыял захоўваецца ў музеі Беларускага Палесся. Гэта быў неардынарны чалавек, чалавек-глыба. І сёння асоба былога партызанскага камандзіра выклікае цікавасць даследчыкаў і навукоўцаў. Не ўсе старонкі яго біяграфіі яшчэ абнародаваны, чакаюць свайго часу мемуары генерала.



За гады вайны партызанскія атрады Каржа знішчылі больш за 20 тысяч чалавек жывой сілы праціўніка, разграмілі больш за 30 нямецкіх гарнізонаў, пяць чыгуначных станцый, пусцілі пад адхон 460 нямецкіх эшалонаў. Усяго ў тыле ворага партызаны правялі 1119 дзён. Адна з самых паспяховых аперацый народных мсціўцаў падчас Вялікай Айчыннай вайны атрымала назву «санны рэйд», калі за два месяцы пачатку 1942 года партызаны знішчылі мноства варожых гарнізонаў. Адну з ключавых роляў сыграла група Васіля Каржа. Менавіта пасля той аперацыі захопнікі пачалі ўспрымаць партызанаў сур'ёзна.

## На шляху да ваеннай кар'еры

Васіль Захаравіч Корж нарадзіўся 13 студзеня 1899 года ў вёсцы Хорастава (цяпер Салігорскі раён Мінскай вобласці). У сакавіку 1921 года з вядомых прычын яго родная Старобіншчына аказалася пад Польшчай. І ўжо ў снежні 1921 года Васіля прызвалі ў польскую армію. Пазней у адной з анкет ён напіша: «У польскай арміі праследаваўся афіцэрамі як нядобранадзейны, 15 сакавіка 1922 года ўцёк адтуль». З Познані «зайцам» на цягніках, а найбольш пешшу — праз лясы і балоты — дабіраўся на радзіму. Але ў родным Хораставе затрымаўся ненадоўга, хутка ўступіў у партызанскі атрад пад камандаваннем Кірыла Арлоўскага: атрад дзейнічаў у Заходняй Беларусі. Дружба, якая зарадзілася ў тую пару, доўжылася паміж Арлоўскім і Каржом усё жыццё.

У атрадзе Арлоўскага за тры гады Корж стаў умелым канспіратарам і вопытным разведчыкам. Пачынаючы з 1925 года чатыры гады Васіль Корж ужо ў БССР працаваў старшынёй калгаса, гэты вопыт яму вельмі спатрэбіцца пасля вайны. А ў 1936 годзе, пасля вучобы на курсах АДПУ-НКУС, ён адпраўляецца добраахвотнікам у Іспанію. Ён ваюе там зноў побач з Кірылам Арлоўскім. І калі апошні, параненым, трапляе ў палон, Корж разам з групай байцоў праводзіць бліскучую аперацыю па вызваленні таварыша і літаральна на руках выносіць яго ў бяспечнае месца. За адвагу і гераізм на іспанскай зямлі наш герой атрымлівае першыя баявыя ўзнагароды — ордэны Чырвонага Сцяга і Чырвонай Зоркі... і першы данос. Менавіта з-за паклёпу нядобразычліўца ў 1938 годзе Васіля Каржа арыштоўваюць у Мінску, кідаюць у «Амерыканку» і дабіваюцца «прызнання» ў тым, што ён польскі шпіён. Але тут ужо Кірыл Арлоўскі ўзнімае на ногі ўсіх знаёмых чэкістаў і вызваляе ні ў чым не вінаватага сябра. У 1940 годзе Васіля Каржа накіроўваюць у Пінскі абкам партыі загадчыкам фінаддзела.

## Партызанскі генерал

Ужо вечарам 22 чэрвеня намаганнямі Васіля Каржа ў Пінску ствараецца адзін з першых у гісторыі Вялікай Айчыннай вайны партызанскіх атрадаў, куды ўвайшлі камуністы і камсамольцы горада. Сярод іх былі Сяргей Карнілаў і яго жонка Вера Харужая, Рыгор Карасёў, Эдуард Нордман. Са зброі атрад меў некалькі вінтовак, па 5—10 пачкаў патронаў на чалавека, гранаты і пару пісталетаў. Але праз тры дні, 26 чэрвеня, партызаны затрымалі нямецкіх разведчыкаў-парашутыстаў, а 28 чэрвеня на дарозе Пінск — Лагішын учынілі засаду на нямецкія лёгкія танкі, здабылі боепрыпасы, карты праціўніка, узялі палонных. Гэты бой, у якім партызаны, дарэчы, не страцілі ніводнага байца, лічыцца першым у гісторыі партызанскага руху СССР. Тая маленькая перамога мела найбольшы псіхалагічны эфект — захопнікі такога яўна не чакалі.

Ужо праз год актыўнай баявой работы злучэнне Каржа мела свой аэрадром, шпіталь для лячэння параненых, у лясной друкарні выходзіла газета «Палеская праўда». Аднак перад гэтым жыццё легендарнага партызанскага камандзіра зноў пэўны час вісела на валаску. І зноў з-за даносу. Васіля Захаравіча выклікалі ў Маскву. Усе думалі, для ўручэння ўзнагароды, а яго арыштавалі. Але, на шчасце, Кірыл Арлоўскі тады працаваў у цэнтральным апараце НКУС. Адным словам, Корж вярнуўся ў атрад, а ў верасні 1943 года яму прысвоілі званне генерал-маёра.

Варта сказаць, што герой вайны адначасова быў і народным героем. Нездарма ж яго памяць так беражліва шануюць землякі. Сваім падначаленым ён казаў: «Мы ваюем за народ. Наша апора і надзея — мясцовае насельніцтва. Ніколі не крыўдзіце мужыка! Галодны — папрасі, людзі апошнім падзеляцца. Сілай возьмеш — ніколі не даруюць. Не крыўдзіць, а бараніць насельніцтва — наша задача!» Засталіся сведчанні таго, як жорстка абыходзіўся ён з рабаўнікамі, мог і застрэліць такога перад строем. Дарэчы, з пачаткам вайны Корж узяў псеўданім Камароў, а яго падшэфных называлі камароўцамі. Дык вось камароўцы стараліся своечасова атрымліваць разведданыя пра планы карных аперацый у вёсках і загадзя выводзілі жыхароў у лес. Такім чынам было выратавана нямала людзей.

## Калгасны старшыня

Пасля вайны Каржа накіроўваюць у Акадэмію Генеральнага штаба Узброеных Сіл СССР, яму прарочылі бліскучую вайсковую кар'еру, але «добразычліўцы» не спынялі спроб нашкодзіць гэтаму чалавеку. Тым больш што ён не змоўчваў дурням альбо баязліўцам. Адным словам, пасля акадэміі Корж вяртаецца ў Беларусь, працуе намеснікам кіраўніка аднаго з міністэрстваў. А потым нечакана для ўсіх звальняецца з міністэрства і едзе ў сваю родную вёску, каб стаць на чале сельгасарцелі «Партызанскі край». Тады яна знаходзілася ў Лунінецкім раёне Брэсцкай вобласці. Калі яго пыталі пра такія кар'ерныя метамарфозы, ён усміхаўся, часам казаў: «Ат, у сталіцы і без мяне гультаёў хапае». А ўнучка Вольга Корж у адным з інтэрв'ю казала: «Дзядуля заўсёды быў просталінейным, казаў праўду ў вочы. Пры гэтым, за што ні браўся, даводзіў справу да поспеху, ці то ў сельскай гаспадарцы, ці ў ваеннай справе. Не злічыць даносаў, у якіх яго спрабавалі паліць брудам, але да яго не прыставала, ён заставаўся чысты перад краінай, народам, сваім сумленнем. Дзе цяпер гэтыя пісакі і дзе мой дзед? Гісторыя ўсё расставіла па сваіх месцах».

Сапраўды, таленавіты чалавек таленавіты ва ўсім. Ён прыйшоў узнімаць калгас, а застаў руіны. Вяскоўцы жылі ў зямлянках. Якая тут барацьба за ўраджай, надоі, прывагі, калі людзям няма дзе жыць! Найперш узяліся за будаўніцтва жылля. Узвялі цагляны завод, вырабілі цэглу, якая ішла на будаўніцтва. У неверагодна хуткі тэрмін па тым часе з'явіліся дамы, дарогі, у вёску прыйшла электрычнасць. Вырасла прадукцыйнасць працы, прыйшоў першы поспех. Пры яго каласальным арганізатарскім вопыце, падтрымцы баявых сяброў ужо ў 1953 годзе гаспадарка стала адной з найлепшых у рэспубліцы. У вёсцы на вачах выраслі фермы, мехдвор, адначасова ўзводзілі школу, бальніцу, паштовае аддзяленне. Пасадзілі сады, саджанцы Корж прывозіў ад свайго сябра Кірыла Арлоўскага.

У пачатку 1960-х калгас ужо ўдзельнічаў у Выставе дасягненняў народнай гаспадаркі СССР. А дом сабе Корж у Хораставе так і не пабудаваў. Жылі з жонкай фактычна ў праўленні калгаса, сям'і адвялі частку будынка з асобным уваходам. У 1963 годзе Васіля Захаравіча праводзілі на пенсію. У 1967-м ва ўзросце 68 гадоў ён памёр: здароўе падарвалі шматлікія выпрабаванні, што выпалі на долю слаўнага партызана, чалавека-легенды. Земляки запомнілі яго надзвычай сціплым, простым, чалавечным. Генеральскую форму апранаў, калі трэба было выбіць штонебудзь для калгаса альбо памагчы былому баявому таварышу. Запомнілі і прасталінейным, шчырым, калі трэба было выкрываць прыстасаванцаў, лайдакоў, дармаедаў у любой структуры і арганізацыі.

І вось цяпер герою вяртаюць належнае на Піншчыне. Летам чакаецца ўрачыстае адкрыццё помніка Васілю Захаравічу Каржу.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
**Фота з адкрытых крыніц.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Святочнае

# МІСІЯ ПАДЗЯКІ

## Гродзенцы віншуюць ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны



**Напярэдадні Дня Перамогі да Раісы СІДЛОВАЙ завіталі прадстаўнікі дэпутацкага корпуса, Кастрычніцкай раённай адміністрацыі горада, прадпрыемства ААТ «Гроднажылбуд», школьнікі, выхаванцы дзіцячага садка і члены Маладзёжнага парламента.**

Святочны натоўп сабраўся каля гарадскога шматпавярховіка, каб у чарговы раз павітаць удзельніцу партызанскага руху Раісу Сідлову. Выхаванцы дзіцячага садка № 35 сваімі рукамі зрабілі святочныя паштоўкі, а яшчэ вывучылі песню «Кацюша», якую праспявалі пад акампанемент загадчыцы садка Алены Жыгалы. Таксама прагучалі вершаваныя радкі ў гонар ветэрана.

— Напярэдадні Вялікай Перамогі па ўсёй краіне праходзіць акцыя віншавання ветэранаў вайны. Раісе Іванаўне пайшоў 95-ы год, яна была сувязной партызанскага атрада імя Панамарэнкі ў Барысаўскім раёне. Пасля вайны пераехала на Гродзеншчыну, тут жылі яе родныя, тут выйшла замуж. Яна ўсё жыццё працавала кранаўшчыцай. Такія людзі — прыклад для маладога пакалення, бо мелі вялікую волю да перамогі, любоў да жыцця і сваёй краіны. Такія якасці дазволілі выстаяць у ваеннае ліхалецце і потым уключыцца ў будаўніцтва разбуранай краіны. Раіса Іванаўна ў літаральным сэнсе ўзнімала горад з руін, дзякуючы ёй паўставалі новыя дамы, раслі мікрараёны, — адзначыла **старшыня Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў Алена ПАСЮТА.**

У Гродне добра ведаюць Раісу Сідлову, якая прайшла баявы шлях яшчэ падлеткам. Сама жанчына з Міншчыны. Напярэдадні вайны яе сям'я жыла ў вёсцы Любатоўшчына. Калі ў вёску прыйшлі фашысты, жыхары пакідалі свае родныя мясціны і хаваліся сярод мясцовых балот. Раісе тады было 12 гадоў.

— З прыходам захопнікаў пачалося страшнае жыццё, — успамінае Раіса Іванаўна. — Нікому не хачу пажадаць таго, што перажыла сама. У 1942 годзе немцы расстралялі майго бацьку, які быў арганізатарам калгаса. З мужчын застаўся толькі брат Аляксандр. Неўзабаве ён пайшоў у партызаны. Прыкладна праз год таксама прыйшлося пакінуць дом, бо нам перадалі, што і нас арыштуюць. Так мы з сястрой апынуліся ў партызанскім атрадзе. Мне даручалі збіраць звесткі для камандавання. Мая сястра Зіна стала сапраўдным байцом, хадзіла на заданні. Яна загінула ад выбуху нямецкай міны на маіх вачах. Да гэтага часу бачу, як узляцела ўгару яе сіняя сукенка. З тае пары не магу глядзець на вяршыні дрэў, бо гэта нагадвае тую трагедыю.

Вайна забрала амаль усю яе сям'ю — бацьку, сястру, брата. Маці не стала адразу пасля вайны. Раіса пачала свой працоўны шлях кранаўшчыцай. На кране працавала больш за 20 гадоў на гродзенскім прадпрыемстве «Гроднажылбуд».

Цяпер у яе вялікая дружная сям'я — дзеці, унукі, праўнукі і прапраўнук. Прыемна, што дзяржава клапоціцца пра ветэранаў, кажа яна. Як удзельніца вайны яна атрымлівае выплаты напярэдадні Дня Перамогі. Але справа не толькі ў грашах, лічыць жанчына. І сацыяльныя службы, і медыцынскія работнікі вельмі ўважліва ставяцца да патрэб ветэранаў, аказваюць неабходную дапамогу. Не забывае сваю былую работніцу і прадпрыемства ААТ «Гроднажылбуд».

— Ветэраны Вялікай Айчыннай вайны змагаліся за мір, за тое, каб будучыя пакаленні не ведалі, што такое вайна, холад і голад. І таму наша мірнае жыццё трэба зберагчы, захаваць краіну і тыя дасягненні, якія беларусы стварылі за мінулы час, — упэўнена Раіса Іванаўна. — У маёй сям'і ўсе патрыёты. Яны ведаюць гісторыю сваёй краіны, якой цаной дасталася незалежнасць. Часта распытваюць мяне аб тым, як мы жылі ў партызанскім атрадзе, як змагаліся. Для нас усіх 9 Мая — гэта самае ўрачыстае свята. Вось і сёлета мы зноў збяромся дружнай сям'ёй, з сябрамі, блізкімі нам людзьмі.

Сёння ў Гродзенскай вобласці пражывае 98 ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, з іх 54 — франтавікі. Некаторым з іх мінула сто гадоў. Ёсць такія, хто наблікаецца да гэтай даты. Напярэдадні Дня Перамогі кіраўніцтва вобласці і раёнаў асабіста наведае ўсіх ветэранаў, каб павіншаваць са святам і ўручыць каштоўныя падарункі.

**Маргарыта УШКЕВІЧ,**
**фота аўтара.**

# ВЫХАВАННЕ ПРЫКЛАДАМ



*Свякроў распавядала, што яе сын, калі быў маленькі, падбіраў і выкідаў у сметніцу кожную абгортку, якая сустракалася на яго шляху. З таго часу асабліва нічога не змянілася. Вясной муж ходзіць і прыбірае смецце за рыбакамі каля нашай вясковай рэчкі. Добры прыклад, як кажуць, заразны. Калі я была ў дэкрэтным адпачынку і часта гуляла па вёсцы з каляскай, дык заўсёды брала з сабой пакет і збірала паперкі ды бутэлькі, якія валяліся ўздоўж дарогі. Цяпер, куды б мы ні ішлі, з радасцю заўважаю, што наш чатырохгадовы Сымон таксама не праходзіць каля кінутай некім паперкі, абавязкова падымае і нясе ў сметніцу.*

*Кожны раз, вяртаючыся з садка, сын прыносіць мне то чароўнае пёрка, то празрысты каменьчык, то духмяную шышку. Гэты клопат малы пераняў ад таты, які часта радуе мяне незвычайнымі падарункамі. Не раз чула, як ён шэпча Сымону: «А давай назбіраем для мамы розных галінак і паставім у вазу. Вось яна здзівіцца, калі на іх распусцяцца лісцікі!»*

*Як казаў Міхаіл Жванецкі, колькі сына ні вучы правільным рэчам, ён усё роўна вырасце такім, як ты. Дзеці бачаць, як мы паводзім сябе ў тых ці іншых сітуацыях і капіруюць мадэлі нашых паводзін. У тым ліку і тое, як мы вырашаем праблемы, ставімся да няўдачы. Калі мы хаваем галаву ў пясок, як страусы, уцякаем ад адказнасці, хлусім, то яны хутчэй за ўсё будуць рабіць гэтак жа.*

*Ніколі не забудуся, як мінулым летам я ўгаварыла мужа паехаць на канцэрт у суседнюю вёску. У разгар свята Сымон, гуляючы, трапіў маленькім каменьчыкам у чужую іншамарку. І ледзь заўважна пашкодзіў фарбу. Мы паспрабавалі даведацца ў людзей, якія стаялі побач, каму належыць тая машына. Але безвынікова: у той вечар было вельмі шмат прыезджых. Тады муж напісаў на паперцы свой нумар тэлефона з просьбай патэлефанаваць і прыцiснуў яе «дворнікам» да лабавога шкла. Наступнай раніцай патэлефанаваў уладальнік таго аўто, дарэчы, сваяк музыкаў, якія ладзілі канцэрт. Ён быў прыемна здзіўлены, што мы пакінулі запіску. І не ўзяў з нас ні капейкі.*

*Неяк у гасцях назірала сітуацыю, як тата зрабіў сыну строгую заўвагу за тое, што ён, замест таго каб бавіць час з іншымі дзецьмі, гуляе ў камп'ютарную гульню. Пры гэтым сам амаль увесь вечар не выпускаў тэлефона з рук. Мне, напрыклад, таксама не падабаецца, што сучасныя дзеці бясконца сядзяць у гаджэтах. Менавіта таму ў Сымона няма свайго смартфона, і мульцікі мы яму паказваем дазіравана. Пры гэтым я разумею, што, калі буду забараняць малому гаджэт, а сама пачну шмат часу праводзіць у інтэрнэце, ён падрасце і перастане мяне слухаць. Можна сто разоў паўтараць, што такое добра і што такое дрэнна, але словы наўрад ці будуць мець чаканы эфект, калі разыходзяцца з дзеяннямі выхавацеляў. Вядомы жарт «рабі, што я кажу, а не тое, што я раблю» з дзіцем не пройдзе.*

*Не сакрэт, што ачышчаны цукар шкодны для здароўя. Менавіта таму многія бацькі хацелі б, каб іх дзеці елі менш не надта карысных слодычаў. Але самі пры гэтым заядаюць стрэс шакаладкамі і пірожнымі. Прынамсі, знаёмая, калі ўцякуе есць марожанае, кажа трохгадоваму сыну, што гэта тваражок. Таму, каб быць шчырымі з сабой, мы з мужам тыдзень таму вырашылі адмовіцца ад цукру. Замяніць яго карыснымі фінікамі, інжырам, морквай, грушамі, мёдам. Калі хочаш навучыць дзіця клапаціцца пра сваё здароўе — трэба пачынаць з сябе. І так ва ўсім. Перад тым, як штосьці з'есці, падумай, а навошта: прынясе гэта карысць ці шкоду? Перад тым, як штосьці сказаць, вызначы, ці не параніш ты сваім словам кагосьці. Перад тым, як нешта зрабіць, пастаў сябе на месца іншага, узваж, ці не будзе камусьці дрэнна ад твайго ўчынку. Каб выхаванне прыкладам (а ён можа быць не толькі станоўчым, але і адмоўным) праз нейкі час бумерангам не вярнулася назад... Памятаеце прытчу пра дзядулю, у якога трэсліся рукі, і калі ён еў, то суп праліваўся на абрус. Сын і нявестка перасталі яго садзіць за стол і падавалі абед за печку. Аднойчы ён хацеў падсунуць міску бліжэй да сябе, але выпадкова ўпусціў яе і разбіў. Нявестка насварылася на старога і сказала, што з гэтага дня будзе падаваць яму ежу ў драўлянай пасудзіне. Праз нейкі час бацькі заўважылі, што іх малы сын старанна скрабе палачкай па дошчачцы. «Што ты робіш?» — пацікавіўся тата. — «Майструю міску, каб, калі вы з маці пастарэеце, карміць вас з яе за печкай»...*

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**


Сямейная газета

Выпуск № 8 (211)


Тыя, хто побач

## Вольга ГАРНІЧАР:

# «СТАРАЕМСЯ БЫЦЬ АДЗІНЫМ ЦЭЛЫМ»

**Яна шчыра прызнаецца: праца ў яе жыцці значыць многае, але сям'я — гэта галоўнае, што павінна быць у чалавека. У гасцях «Сямейнай газеты» — цудоўная маці і жонка, знакамітая спявачка, артыстка-вакалістка Магілёўскай абласной філармоніі, вядучая майстар сцэны, лаўрэат рэспубліканскіх і міжнародных конкурсаў, уладальніца медаля Францыска Скарыны, гранта Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у галіне культуры, член праўлення Саюза музычных дзеячаў Беларусі Вольга ГАРНІЧАР.**



***— Вольга, прадстаўце, калі ласка, сябе нашым чытачам.***

— Я магіляўчанка, але нарадзілася на Поўначы ў Комі АССР, паколькі бацька быў ваенным. А калі мне споўнілася восем, пераехалі сюды, дзе мамiны і татавы карані. Памятаю, як адразу пасля пераезду жылі ў нашай бабулі ў аднапакаёвай кватэры з падсяленнем — прыемная настальгія.

У сям'і я першаадкрывальнік: ніхто з родных не быў звязаны з музыкай. Мама адправіла мяне ў музычную школу па класе акардэона ў шэсць гадоў, цяпер гэта гімназія-каледж мастацтваў імя Яўгена Глебава. Не было і думкі, што жыццё звяжу з музыкай. Аднак, калі прыйшлося паступаць ва ўніверсітэт, абрала педагагічны факультэт. У мяне двайная спецыяльнасць — «Настаўнік пачатковых класаў і музыкі».

***— Якія традыцыі пануюць у вашай сям'і, як бавіце час?***

— Большасць свайго часу мы любім праводзіць разам. Нам вельмі важна пагаварыць, абмеркаваць дзень. Любім усе збірацца за сталом.

***(Заканчэнне на 3-й стар. «СГ».)***

Далікатная тэма

# Каб вясна працягвалася!

## Як перанесці цяжкую страту

**Вясна ў мяне пачынаецца з таго дня, калі бабуля Анюта ўпершыню пасля доўгай зімы садзіцца пагрэцца на сонейку на сваю зялёную лаўку пры дарозе. Я кідаю ўсе свае справы і «машчуся» побач. І мая 88-гадовая суседка, як дзіця, радуецца кампаніі. Спачатку мы абменьваемся навінамі — добрымі і не вельмі. Прынамсі, сёлета ад бабулі Анюты я даведалася, што напрадвесні ў суседняй вёсцы пайшоў з жыцця малады мужчына, у якога засталіся «гараваць» жонка і двое дзетак...**



Далей суседка каторы раз згадвае сваё няпростае жыццё. Як згарэў дом, як адна падымала на ногі дзяцей. «Ведаеш, я і бацькоў пахавала, і мужа. Усё перажыла. А вось смерць сына і ўнучкі прыняць не магу, — прыкладае руку да сэрца, — дагэтуль вось тут баліць, не адпускае. Яны ж сышлі зусім маладымі. Унучцы было ўсяго 18, легла спаць і не прачнулася. У сне спынілася сэрца. Неўзабаве пасля ўнучкі сышоў на неба і яе тата, мой сын Вова. Хаваць сваіх дзяцей — гэта страшны боль, які не перадаць словамі. Нават ворагу не пажадаю такое перажыць. Часам думаю, лепш бы мяне замест іх Бог забраў. Але ў Яго, відаць, на кожнага з нас свае планы»...

Пра тое, як перажыць смерць блізкага чалавека, паразмаўлялі з **сямейным псіхолагам Таццянай ШАРАНДАЙ.**

## Пра пачуццё віны і аблягчэнне

***— Насамрэч людзей, якія страцілі дзяцей, нямала. Знаёмая жанчына, якая трыццаць гадоў таму пахавала гадавалага сына, прызналася: «Калі вам хтосьці будзе казаць, што час лечыць — не верце. Час не лечыць, ён проста прытупляе боль». Як жыць з такім болем і ці можна наноў навучыцца атрымліваць радасць ад жыцця?***

— Самая галоўная памылка многіх маці, што яны «пакіраюць» разам са сваім дзіцём. Забываючыся на тое, што іх уласнае жыццё — каштоўны дар, які трэба цаніць. Тым самым шкодзяць не толькі сабе, але і сваім блізкім. Шмат гадоў таму да мяне на кансультацыю прыйшла жанчына. На той момант у яе год як памёр малодшы сын-падлетак. Мама і тата спрабавалі яго выратаваць: падключалі ўсе сувязі, куплялі дарагія прэпараты, шукалі донараў. Пасля смерці хлопца жанчына з галавой сышла ў сваё гора. Пакуль бацькі займаліся сынам, а потым вельмі цяжка перажывалі яго сыход, іх старэйшая дачка захварэла на анкалогію. Неўзабаве мужчына не вытрымаў. І гэта вельмі моцная жанчына засталася сам-насам са сваёй хворай дачкой. Яна прыйшла да мяне з адной мэтай: «Я не хачу быць для сваёй дачкі вампірам, я хачу быць для яе донарам».

***(Заканчэнне на 4-й стар. «СГ».)***

Дом без гвалту

# Калі злачынца — блізкі чалавек...

## Як не дапусціць хатняй тыраніі і выратавацца ад яе наступстваў

**Кожнае трэцяе забойства ў Беларусі здзяйсняецца рукамі сваякоў, а кожны чацвёрты беларус атрымлівае цяжкія цялесныя пашкоджанні ад блізкіх людзей. Штогод органамі ўнутраных спраў у краіне рэгіструецца каля 80 тысяч паведамленняў аб хатнім гвалце, аднак насамрэч гэтая лічба большая. Як дапамагчы ахвярам, якія пацярпелі ад рук родных, расказалі спецыялісты.**



### Прафілактычны ўлік і папераджальныя прадпісанні

Работа па прафілактыцы сямейнага гвалту вядзецца адпаведнымі органамі сістэматычна. Супрацоўнікі органаў унутраных спраў маюць сур'ёзны інструментарый для рэагавання на гэтую праблему. Летась да адміністрацыйнай адказнасці за дамашнюю тыранію было прыцягнута звыш 49 тысяч грамадзян, расказаў **Сяргей КРАСУЦКІ, намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення — начальнік упраўлення прафілактыкі галоўнага ўпраўлення аховы правапарадку і прафілактыкі міліцыі грамадскай бяспекі МУС:**

— Летась істотна змянілася заканадаўства аб прафілактыцы правапарушэнняў, якое датычыцца найперш прафілактыкі хатняга гвалту. Цяпер можна на ранняй стадыі прымяняць шырокі спектр папераджальных мер для барацьбы з хатнім гвалтам. Гэта прафілактычны ўлік, дзе знаходзіцца зараз 21 тысяча грамадзян, а таксама абаронныя прадпісанні — за два месяцы 2023-га прыменена ўжо пяць тысяч мер такой індывідуальнай прафілактыкі правапарушэнняў (у большасці гэтых выпадкаў чалавек, які здзейсніў насілле, выдаляецца з агульнай з ахвярай жылплошчы).

Дакладна вызначаны таксама абавязкі кожнага суб'екта прафілактыкі правапарушэнняў, у тым ліку прадстаўнікоў Мінпрацы, Мінадукацыі, Міністэрства аховы здароўя і іншых. Самае галоўнае пры гэтым — захаваць чалавечае жыццё і аказаць дапамогу, найперш жанчынам і дзецям. Прафілактычная работа, якая праводзіцца, дазваляе ў цэлым не дапусціць сур'ёзных змен па здзяйсненні цяжкіх і асабліва цяжкіх злачынстваў у сферы хатняга гвалту. Адзначаецца таксама змяншэнне колькасці такіх злачынстваў, дадаў прадстаўнік МУС:

— Па выніках трох месяцаў колькасць забойстваў знізілася на 10 %, нанясенне цяжкіх цялесных пашкоджанняў паменшала на трацінy, аднак заспакойвацца на гэтым рана.

Званок са скаргай аб насіллі ў міліцыю не азначае, што нехта адразу будзе прыцягнуты да адказнасці, паколькі добра наладжана ўзаемадзеянне з іншымі органамі, падкрэсліў Сяргей Красуцкі:

— Калі чалавек не жадае разбіральніцтва ў межах крымінальнага ці адміністрацыйнага працэсу, мы можам прыняць інфармаваную згоду і параіць чалавеку, куды звярнуцца.

### Адрасныя наведванні пацярпелых і злачынцаў

Адным з элементаў сумеснай работы МУС і адпаведных органаў па прафілактыцы хатняга гвалту ў краіне стала традыцыйная красавіцкая акцыя «Дом без насілля». У яе межах супрацоўнікі выступаюць у працоўных і навучальных калектывах, наведваюць падулікóвых грамадзян, найперш тых, хто неаднаразова прыцягваўся да адміністрацыйнай адказнасці, а таксама «прытоны», дзе адбываліся выпадкі хатняга гвалту.

Не забываюцца і пра тых, хто скардзіўся на хатні гвалт, але злачынца так і не быў прыцягнуты да адміністрацыйнай адказнаці (найперш з-за нежадання самой ахвяры). Разглядаюцца і пытанні аб абмежаванні дзеяздольнасці і накіраванні ў лячэбна-працоўныя прафілакторыі. Пад узмоцненым кантролем падчас акцыі таксама сем'і з дзецьмі, якія прызнаны асобамі, што знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы.

### Інфармацыйная дапамога — кожнаму непаўналетняму

Меры па прафілактыцы хатняга гвалту ў дачыненні да непаўналетніх прымаюцца і ва ўстановах адукацыі. На асаблівы кантроль узяты пытанні планавання выхаваўчай работы і алгарытму інфармавання педработнікаў, бацькоў, апекуноў, папячыцеляў і навучэнцаў аб гвалтоўных фактах, якія існуюць у дачыненні да непаўналетніх. Наладжана міжведамасная работа па выяўленні неспрыяльнай для дзяцей абстаноўкі, каардынуецца ўзаемадзеянне з сям'ёй з боку розных службаў, акрэсліла **Наталля ЧААБ, кансультант упраўлення сацыяльнай, выхаваўчай і ідэалагічнай работы Міністэрства адукацыі:**

— Ва ўстановах адукацыі арганізавана прафілактычная работа з усімі ўдзельнікамі адукацыйнага працэсу па павышэнні псіхолага-педагагічнай культуры, прадухіленні гвалту, жорсткага абыходжання з дзецьмі. Ладзяцца тэматычныя размовы з вучнямі, як абараніць сябе, калі дзіця апынулася ў адпаведнай сітуацыі. Вучням паведамляецца кантактная інфармацыя, куды можна звярнуцца па дапамогу. Гэтыя ж звесткі знаходзяцца на сайце Рэспубліканскага цэнтра псіхалагічнай дапамогі. Даступныя яны і праз QR-код у дзённіках.

У краіне працуе 146 сацыяльна-педагагічных цэнтраў, 94 з якіх маюць у сваім складзе дзіцячыя сацыяльныя прытулкі. Нумары тэлефонаў даверу для дзяцей змешчаны на інфармацыйных стэндах у школах і на іх сайтах.

**«Насілле па-ранейшаму застаецца сур'ёзным выклікам у справе дасягнення фактычнай роўнасці мужчын і жанчын. Нацыянальным планам дзеянняў па забеспячэнні гендарнай роўнасці на 2021—2025 гады ў раздзеле «Супрацьдзеянне хатняму гвалту і гандлю людзьмі» прадугледжаны шэраг мерапрыемстваў па павышэнні эфектыўнасці супрацьдзеяння хатняму гвалту, у тым ліку аказанне дапамогі пацярпелым асобам».**

**Летась у тэрытарыяльныя цэнтры па дапамогу звярнулася больш як 12 тысяч грамадзян, якія пацярпелі ад хатняга гвалту, — 90 % з іх жанчыны і звыш трох тысяч — сем'і з дзецьмі да 18 гадоў. 483 чалавекі звярнуліся па дапамогу асабіста, 724 — па накіраванні органаў адукацыі, 43 — па накіраванні рэлігійных арганізацый, астатнія — па накіраванні органаў унутраных спраў. Сацыяльныя паслугі аказаны амаль 13 тысячам грамадзян, якія пацярпелі ад хатняга гвалту.**

### «Бацькоўскі ўніверсітэт» і сацыяльнае расследаванне

Для бацькоў існуе праект «Бацькоўскі ўніверсітэт», куды запрашаюць зацікаўленых суб'ектаў прафілактыкі, і бацькі могуць звярнуцца да іх з пытаннямі. Калі паступае інфармацыя аб неўладкаванасці ў сям'і, неадкладна праводзіцца сацыяльнае расследаванне, якое дазваляе комплексна ацаніць сітуацыю ў сям'і і становішча дзіцяці ў ёй.

— У краіне назіраецца станоўчая дынаміка па ліквідацыі неспрыяльных сітуацый для дзяцей, якія знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы. 22 031 дзіця летась знята з гэтага ўліку, — паведаміла Наталля Чааб. — Пры гэтым 16 981 дзіця знята з уліку пасля нармалізацыі сітуацыі ў сям'і.

### Схавана ад вачэй — не азначае, што не існуе

Праблема хатняга гвалту характарызуецца высокім узроўнем латэнтнасці, бо прыватнае сямейнае жыццё часта схавана ад чужога вока. Менавіта таму так важна расказваць пра яе існаванне, каб прыцягнуць увагу грамадскасці, упэўнены **Арцём МАЛМЫГІН, загадчык сектара наркалагічнага маніторынгу і прэвенталогіі Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра псіхічнага здароўя:**

— У беларускім грамадстве сустракаюцца ўсе формы сямейнага гвалту: псіхалагічны, фізічны, эканамічны і сексуальны, і першае месца займае менавіта псіхалагічны.

Каб павысіць дасведчанасць насельніцтва ў гэтай тэме, Міністэрства аховы здароўя ладзіць лекцыі, семінары, навучальныя трэнінгі і заняткі. Частка з іх скіравана на абазначэнне прыкмет хатняга гвалту. Медсупрацоўнікі пастаянна наведваюць установы адукацыі і выступаюць у калектывах. І не трэба саромецца задаваць урачам пытанні па тэме.

### Патрэба ў крызісных пакоях і сацыяльным патранаце

Насілле па-ранейшаму застаецца сур'ёзным выклікам у справе дасягнення фактычнай роўнасці мужчын і жанчын. Нацыянальным планам дзеянняў па забеспячэнні гендарнай роўнасці на 2021—2025 гады ў раздзеле «Супрацьдзеянне хатняму гвалту і гандлю людзьмі» прадугледжаны шэраг мерапрыемстваў па павышэнні эфектыўнасці супрацьдзеяння хатняму гвалту, у тым ліку аказанне дапамогі пацярпелым асобам, паведаміла **Алена КОМЛІК, кансультант упраўлення народанасельніцтва, гендарнай і сямейнай палітыкі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны:**

— Асноўная дзейнасць Мінпрацы ў сферы супрацьдзеяння хатняму гвалту скіравана на развіццё ўстаноў, якія аказваюць дапамогу пацярпелым ад гвалту, і павышэнне якасці аказання паслуг. У сістэме ведамства існуюць 146 тэрытарыяльных цэнтраў сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва і два гарадскія цэнтры сацыяльнага абслугоўвання сям'і і дзяцей (у Мінску і Гомелі). У гэтых установах аказваюцца кансультацыйна-інфармацыйныя, сацыяльна-псіхалагічныя паслугі, а таксама паслугі пасрэднікаў, сацыяльнага патранату, часовага прытулку.

Апошняя з пералічаных паслуг аказваецца людзям, якія маюць патрэбу ў бяспечным пражыванні. Для гэтага развіваецца сетка крызісных пакояў. Іх цяпер 136, дзе арганізавана 435 койка-месцаў, у тым ліку 129 — для дзяцей. Летась такая паслуга была аказана 591 грамадзяніну, 330 з якіх пацярпелі ад гвалту ў сям'і.

Заканадаўства пастаянна ўдасканальваецца, узяўшы кірунак на спрашчэнне выдзялення прытулку і аказанне комплекснай паслугі пацярпелым ад гвалту. Наладжаны кругласутачны доступ у крызісны пакой. Пацярпелы бясплатна забяспечваюцца пасцельнай бялізнай і, калі неабходна, сродкамі гігіены, ежай і піццём, удакладніла прадстаўніца Мінпрацы:

— Паслуга аказваецца незалежна ад месца жыхарства ці рэгістрацыі, а пры экстраннай неабходнасці — і без дакумента, які сведчыць асобу (на падставе пісьмовай заявы пацярпелага). Аднак цягам трох дзён дакумент неабходна прад'явіць або звярнуцца па аднаўленне ў органы ўнутраных спраў, калі дакумент быў страчаны. Тэрмін пражывання вызначаецца ў дагаворы і можа быць працягнуты з улікам абставін. Пры неабходнасці пацярпелым дапамагаюць у пошуках працы і жылля, наладжванні сваяцкіх сувязяў.

Паслуга сацыяльнага патранату — міжведамаснае суправаджэнне асоб, якія знаходзяцца ў цяжкай жыццёвай сітуацыі, — скіравана на аднаўленне нармальнай жыццядзейнасці, мабілізацыю і рэалізацыю ўласнага патэнцыялу грамадзян для вырашэння праблем. Летась такой паслугай скарыстаўся 671 пацярпелы ад хатняга гвалту.

**Ірына СІДАРОК.**

# «СТАРАЕМСЯ БЫЦЬ АДЗІНЫМ ЦЭЛЫМ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

Увогуле, мы стараемся быць адзіным цэлым. Ёсць традыцыя падарожнічаць. Кожны год па магчымасці выязджаем на мора, абажаем праводзіць час у горадзе Ейску, дзе жывуць нашы родныя. У Магілёве заўсёды гуляем у парку Падніколле, катаемся на каруселях, самакатах і роліках.

***— Як спраўляецеся з роляй мамы і артысткі?***

— Роля мамы, акрамя клопату і адказнасці, прыносіць шмат радасці. У мяне ёсць вялікая падтрымка — мае бацькі, якім я вельмі ўдзячна. Калі дачка была маленькая, яны дапамагалі, у гэтым вялікі плюс. Мая сям'я з разуменнем ставіцца да майго творчага жыцця і радуецца маім поспехам.

**«За ўсё наша жыццё я ніколі не пачула дрэннага слова ад мужа. Па яго інтанацыі адчуваю, у якім ён настроі».**

***— Дачка Анастасія пайшла па вашых слядах. Яна вучыцца музыцы ў гімназіі, дзе вы працуеце. Напэўна, складана быць мамай і педагогам адначасова?***

— Я вельмі люблю кантактаваць з дзецьмі. Акрамя працы ў філармоніі, больш за 12 гадоў выкладаю вакал у Магілёўскай гарадской гімназіі № 1, дзе ў 8 класе вучыцца мая дачка па класе вакалу і фартэпіяна. У мяне да ўсіх маіх выхаванцаў адносіны аднолькавыя. А з дачкой нам разам камфортна, бо мы лёгка знаходзім агульную мову.

***— Ваш муж — прадстаўнік творчай прафесіі?***

— Людзі часта думаюць, што Віталь — творчы чалавек, але ён не з гэтай сферы. Проста ў мужа своеасаблівы стыль — скура, ланцугі... Ён падобны да рокера ці байкера. Сам сабе шые скураныя рэчы, берэткі, вопратку. Ён творчы чалавек менавіта ў гэтым плане.

Яго карані ў Закарпацці, бацька-ваенны адтуль родам. Маці з Магілёва. Калі сям'я распалася, Віталь з матуляю пераехалі ў Беларусь.



Побач з дачкой.

А сустрэліся мы ў магілёўскім рэстаране, дзе я калісьці працавала. Нашы адносіны закруціліся хутка, і, дзякуй богу, мы 16 гадоў разам ідзём па жыцці. Я гэтым вельмі задаволеная (*усміхаецца*).

***— Як вам Віталь зрабіў прапанову?***

— Проста паставіў перад фактам і ўсё. Сказаў, што з'язджае ў камандзіроўку, а калі праз месяц прыедзе, мы пажэнімся. Гэта называецца — узяў справу ў свае рукі і зрабіў тое, што трэба (*смяецца*)!

***— А якім было ваша вяселле?***

— Звычайным, гулялі два дні. Дзякуючы творчаму жыццю мяне вельмі цяжка здзівіць фотасесіямі, відэаздымкамі і гэтак далей. Падчас вяселля аператар не ведаў, як запісаць наша відэа, бо мы не хацелі ні круціцца, ні скакаць (*смяецца*). Але, каб не пакрыўдзіць відэографа, у рэшце рэшт зрабілі ўсё, што ад нас патрабавалася (*усміхаецца*).

***— Як спраўляецеся з расставаннямі? Не сумуеце, калі муж у ад'ездзе?***

— Муж па сваёй рабоце часта бывае ў камандзіроўках. Але нашы расставанні нядоўгія. Мы шмат часу праводзім разам. Ад'езды мужа не перашкаджаюць нашай сям'і і не ўплываюць на нашы адносіны, бо ў мяне таксама канцэрты, шмат гастроляў па розных гарадах і краінах. Я не паспяваю адчуць адсутнасць каханага. Мы жывём шчасліва і ніколі не сварымся, бо разумеем адно аднаго.

**Хачу параіць сямейным людзям: старайцеся саступаць адно аднаму, быць цярплівымі, разумець і чуць адно аднага, не гарачыцца, не лаяцца. Павінен прайсці час, каб людзі прыцёрліся, навучыліся саступаць. Галоўнае ў сямейным жыцці — узаемапавага, мудрасць і, вядома, каханне!**



Дачка Анастасія.

***— Няўжо сапраўды ніколі не сварыцеся?***

— За ўсё наша жыццё я ніколі не пачула дрэннага слова ад мужа. Па яго інтанацыі адчуваю, у якім ён настроі. Калі ён злуецца, называе мяне Воля (*смяецца*), а звычайна звяртаецца ласкава — Вольчык, Волік. Муж у мяне спакойны, лагодны. А я эмацыянальная, хоць увогуле неканфліктны чалавек, нягледзячы на мой яркі знешні выгляд.

***— Ці ёсць у вашых адносінах месца для рэўнасці?***

— Шчыра — ніколі не давала падстаў, а ўвогуле мы абое не раўнівыя.

***— Хто галоўны кухар на вашай кухні? Якія стравы любіце гатаваць?***

— Ёсць некалькі традыцыйных страў, якія абавязкова прысутнічаюць на святах, але ўсё ж мы аддаём перавагу беларускай кухні. Любім звычайныя — бульбу, суп, дранікі. Але ж і эксперыментуем таксама. Гатуем шмат страў з іншых нацыянальных кухань, напрыклад такан з брынзай, кнэдлікі з падлівай, боршч з фасоляй... Штосьці я люблю гатаваць з закарпацкай кухні, напрыклад боршч, у які дадаю фасолю і капусту кальрабі. Шмат падказвае муж: Віталь гатуе разнастайна, смачней за мяне. Падчас сямейных свят усе разам рыхтуем вячэру — мама смажыць катлеты, я нарэзаю салату, а Віталь упрыгожвае стол, чысціць, мые і гэтак далей.

***— Хто ў вашай сям'і адказвае за бюджэт?***

— Бюджэт у нас агульны. Усе працуюць — усе трацяць (*смяецца*).

***— Вольга, што для вас каханне?***

— У маладосці — гэта жарсці, захапленне... А ўвогуле, гэта калі ты разумееш, цэніш, паважаеш, беражэш свайго чалавека. Гэта калі існуюць звычка і сувязь у добрым сэнсе. Калі ты клапоцішся пра чалавека, значыць, кахаеш. Ён становіцца родным. Калі няма рэакцыі ў адказ, аддачы, значыць, гэта не каханне. У мяне пытаюцца іншы раз: за што я люблю свайго мужа — за тое, што ён любіць мяне (*смяецца*)!

**Надзея ЗУЕВА.**

**Фота з уласнага архіва сям'і ГАРНІЧАР.**

## Бліц-апытанне:

**1. Чаму вы параілі б наведаць філармонію?**

— Філарманічныя канцэрты абстрагуюць ад турбот. У жыцці павінна быць разнастайнасць.

**2. Кніга?**

— Вельмі люблю чытаць у дарозе. Маю другую адукацыю юрыдычную, таму люблю дэтэктывы, асабліва Сідні Шэлдана.

**3. Кветкі?**

— Палявыя. Ружы не люблю.

**4. Сочыце за модай?**

— Я нашу тое, у чым мне ўтульна. А калі хочаце мяне бачыць прыгожай — прыходзьце на мае канцэрты (*смяецца*)!

**5. Дыета?**

— Не дыеты, хутчэй, абмежаванне ў тым, што я люблю, і ў тым, што мне нельга. Каб залезці ў любімую сукенку, трэба часцей закрываць рот (*смяецца*)!

**6. Упрыгажэнні?**

— Люблю серабро, набываю аб'ёмныя ўпрыгажэнні, аднак я не фанат.

**7. Водар?**

— Пяшчотны, лёгкі, амаль незаўважны.

**8. Раніца немагчыма без...**

— Кавы.

**9. Якасці мужа, якія падкупілі?**

— Павага і клопат.

**10. Сям'я — гэта...**

— Крэпасць, тыл, самае роднае і важнае, што павінна быць у чалавека.

**11. Што для вас галоўнае ў людзях?**

— Шчырасць і дабрадушнасць — чакаю гэтага ў адказ.

**12. Назавіце галоўную якасць свайго характару?**

— Прамалінейнасць. Але сказаць так, каб нікога не пакрыўдзіць, не зрабіць дрэнна, не схлусіць.

---

Адпачынак

# Сезон атракцыёнаў адкрыты!

## Якія сюрпрызы чакаюць наведвальнікаў сталічных паркаў

**Напрыканцы красавіка ў парках Мінска пачалі працаваць атракцыёны. Якімі навінкамі яны парадуюць гараджан і гасцей сталіцы? Ці з'явяцца новыя дзіцячыя гульнявыя комплексы? Ці будуць павялічаны цэны на білеты?**

— Мы робім усё неабходнае, каб гарадскія паркі сталі больш прывабнымі, утульнымі і бяспечнымі для наведвальнікаў, — адзначыў **намеснік генеральнага дырэктара, галоўны інжынер УП «Мінскзеленбуд» Руслан КАСЕВІЧ.** — Перад адкрыццём сезона ўсе атракцыёны прайшлі неабходную праверку на бяспеку і спраўнасць. Але хацелася б нагадаць, што бяспека часта залежыць не толькі ад стану атракцыёнаў, але і ад саміх людзей. Апошнім неабходна ўважліва слухаць дзяжурнага, выконваць усе ўказанні, не спяшацца.

Ужо стала добрай традыцыяй закупка новых атракцыёнаў да адкрыцця сезона. У прыватнасці, сёлета парк Чалюскінцаў папоўняць надзіманы комплекс і 5D-кінатэатр. Яшчэ адзін батутны комплекс з'явіцца ў парку 900-годдзя Мінска. У парку Горкага плануюць устанавіць басейн з электралодачкамі і 5D-атракцыён.

— У парку Горкага ўжо 20 гадоў працуе домік Дзеда Мароза, дзеці з задавальненнем наведваюць яго перад Новым годам, — адзначыла **начальнік сектара культурна-масавай і спартыўнай работы «Мінскзелянбуда» Лідзія ВЕЖНАВЕЦ.** — Мы падумалі, што інтэрактыў зімой у нас у парку ёсць, а летам яго не хапае. І вырашылі выправіць сітуацыю — зрабіць сюрпрыз для мінчан і гасцей сталіцы. Таму бліжэй да сярэдзіны сезона ў парку Горкага чакаецца адкрыццё інтэрактыўнай пляцоўкі «Лукамор'е». Яна будзе стылізавана і абсталявана па матывах дзіцячых казак. Там плануем устанавіць вялікія фігуры Змея Гарыныча, Бабы-ягі, хатку на курыных ножках і іншыя аб'екты. У гэтай зоне будуць працаваць аніматары, якія прапануюць наведвальнікам прайсці паласу перашкод, выканаць розныя заданні. Што цікава, казачныя фігуры будуць рэагаваць на эмоцыі наведвальнікаў. На тэрыторыі «Лукамор'я» можна будзе адзначаць дзіцячыя дні нараджэнняў. Праграма квэсту разлічана на 25-30 хвілін.

Усяго ў парках Горкага, Чалюскінцаў і 900-годдзя Мінска налічваецца 67 атракцыёнаў — як упраўлення «Гарадскія паркі» УП «Мінскзелянбуд», так і прыватных. Рэжым работы застаецца ранейшым. У парку Горкага і Чалюскінцаў наведаць атракцыёны можна ў любы дзень, акрамя панядзелка, а ў парку 900-годдзя Мінска выхадныя — панядзелак і аўторак. Працаваць паркі будуць з 11.00 да 21.00, а ў пятніцу, суботу, перадсвяточныя і святочныя дні — да 22.00. У месцах масавага адпачынку гараджан па традыцыі адчыняцца пункты пракату спартыўнага інвентару.

Цана білетаў, паводле слоў Руслана Касевіча, застанецца на ўзроўні мінулага года і складзе ад 1,5 да 8 рублёў (самы дарагі — гэта VR-атракцыён). У цэлым сярэдняя цана квітка — 2-2,5 рубля. «Самы папулярны атракцыён — кола агляду вышынёй 54 метры ў парку Горкага. Яго наведала летась больш за 1 млн 200 тыс. чалавек. Яшчэ з папулярных — аўтадром, «Задыяк», «Вальс», «Ладдзя».

Дарэчы, у парку імя 50-годдзя Вялікага Кастрычніка атракцыёны сёлета запускаць не будуць. Зону адпачынку чакае рэканструкцыя са змяненнем канцэпцыі, у выніку якой парк набудзе спартыўную скіраванасць. Каруселі, якія выпрацавалі свой рэсурс, спішуць, астатнія размяркуюць па іншых парках.

— Летам сем'і наведваюць не толькі платныя, але і бясплатныя гульнявыя комплексы, якія знаходзяцца на тэрыторыі паркаў, — дадаў Руслан Касевіч. — Вялізная просьба да бацькоў: сачыце за сваімі дзецьмі! Перш чым пускаць іх на такія комплексы, азнаёмцеся з правіламі карыстання, якія размешчаны побач на стэндзе.

Лідзія Вежнавец нагадала, што ў парку Чалюскінцаў з 1 красавіка працуе любімая многімі танцавальная пляцоўка «Сустрэча».

— Да нас прыходзяць у асноўным людзі старэйшага пакалення ад 45 да 85 гадоў, але пры гэтым не забаронена прыйсці і патанцаваць любому чалавеку, пачынаючы з 16 гадоў. Вельмі кранальна, калі ўнукі прыводзяць сюды сваіх бабуль і дзядуль і танцуюць з імі разам. Праграма стартуе ў 16.00 па суботах і нядзелях. Па просьбах пастаянных наведвальнікаў апошнія два гады мы працуем ажно да 1 снежня.

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**

# Каб вясна працягвалася!

*(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

Я параіла ёй працэс аднаўлення пачаць з цела. Яна стала бегаць у поле, крычаць, плакаць, каталася па зямлі, стукала па ёй кулакамі. Яна казала, што пасля гэтага станавілася лягчэй. Вялізную гаючую сілу маюць дрэвы, асабліва дуб. Пад Мінскам ёсць дубовы гай, яна ездзіла туды і доўга стаяла ў абдымку з дрэвам. Такім спосабам выратоўвалася, набіралася сіл. Важна разумець: што б ні здарылася, з якімі б выпрабаваннямі мы ні сутыкнуліся, жыццё працягваецца. Таму трэба падумаць пра сябе, пра сваіх блізкіх. Чаго б гэта ні каштавала, рабіць усё, каб перанесці фокус увагі на штосьці эмацыянальна значнае. Пасля страты любімага чалавека з'яўляецца эмацыянальная пустата, якая аддае болем. Яе абавязкова трэба чымсьці запоўніць.

***— У псіхалогіі выдзяляецца пяць стадый гаравання: шок (адмаўленне), гнеў (пачуццё віны), гандаль, дэпрэсія, прыняцце. Як правільна пражыць кожную з іх?***

— Працэс гаравання складаны, і стадый у ім насамрэч больш, чым пяць. У сярэднім чалавек праходзіць усе этапы за 1-1,5 гады. Гаруючы, можа пераскокваць стадыі, вяртацца назад, ісці ў сваім парадку і тэмпе. Гэта натуральна і нармальна. Няма жорсткай схемы пражывання гора. Кожны чалавек перажывае яго па-свойму. Магу сказаць з уласнага досведу: усё залежыць ад многіх абставінаў. Мой муж, напрыклад, шэсць гадоў хварэў. І да таго, што ён «сыдзе», я ўжо была маральна гатова. Таму ні шоку, ні адмаўлення, ні гневу, ні дэпрэсіі ў мяне не было. Магчыма, дэпрэсія трансфармавалася. Я проста пераключылася, сышла ў актыўную дзейнасць. І тым самым запоўніла сваю эмацыянальную пустату. Працягвала шмат працаваць з кліентамі, дапамагаючы іншым. Увесь вольны час праводзіла на дачы. Штосьці прыбірала, насіла, перастаўляла. Фізічная актыўнасць мне дапамагала, яна зніжала стрэс. Можа, я скажу зараз тое, што выкліча асуджэнне, але са смерцю мужа я адчула ў тым ліку і аблягчэнне. Хто быў на маім месцы, зразумее мяне, бо шмат гадоў запар даглядаць цяжкахворага — тое яшчэ выпрабаванне. Таму сыход мужа я цяпер успрымаю ў тым ліку як клопат пра мяне. Вельмі дапамагае перажыць страту практыка ўдзячнасці. Штодзень у думках кажу яму: «Саша, дзякуй табе, родны, за ўсё добрае, што мы перажылі разам». Цудоўная тэрапія, калі ты працягваеш справу свайго блізкага. Напрыклад, жонка збірае перапіску мужа з іншымі людзьмі, каб напісаць пра яго кнігу, пакінуць памяць аб чалавеку.

**«Адназначна не варта казаць фразы накшталт «Нічога страшнага, справімся» ці «Хопіць аб гэтым размаўляць». Тым самым вы абясцэньваеце чужыя пачуцці».**

***— Часта чула ад людзей, якія пахавалі блізкага: «А калі б мы паставілі замкі на вокны, то бяда не здарылася б», «А калі б я тады не грымнула дзвярыма і не сышла...» Як змагацца з пачуццём віны?***

— Чалавек схільны вінаваціць сябе, урачоў. Крыўда можа ўзнікнуць нават у адносінах да партнёра, які памёр. Маўляў, сышоў, пакінуў мяне адну з дзецьмі... Што такое пачуццё віны, я ведаю не па чутках. У маім выпадку яно звязанае не толькі з сыходам мужа, але і са смерцю бацькоў. Мама ў мяне памерла ад анкалогіі. Я доўга вінаваціла сябе за тое, што была няўважлівай і прапусціла яе захворванне. Калі маме паставілі дыягназ, у яе ўжо



**«Пачуццё віны канструктыўнае, калі яно кароткачасовае і калі ты маеш магчымасць выправіць сваю памылку. У астатнім яно шкоднае».**

была чацвёртая стадыя. Гадоў сем я мэтанакіравана працавала з гэтым пачуццём віны. Тое ж самае і з мужам: я вінаваціла сябе за тое, што прапусціла ў яго першыя сімптомы хваробы Альцгеймера. І гэта пры тым, што я неаднаразова расказвала сваім кліентам, што яна сабой уяўляе. Пры гэтым да апошняга не дапускала нават думкі, што інжынер-канструктар з саракагадовым стажам можа захварэць на такую хваробу. Калі Саша сышоў, пачуццё віны ў мяне было вельмі вялікае. І ад яго не так проста пазбавіцца. Гэта працяглая работа над сабой. Пачынала я з таго, што прызнавала яго ў сабе. Пасля гэтага стала ўключаць усведамленне яго бессэнсоўнасці. Я сабе гаварыла: «Саша памёр, я проста павінна прыняць дадзены факт. Які сэнс сябе вінаваціць, калі я ўжо нічога не магу змяніць». Пасля гэтага я вучыла сябе бачыць адмоўны ўплыў пачуцця віны на маё жыццё. Яно разбурае. Ты нават не заўважаеш, як страчваеш энергію, як сам сябе забіваеш. Гэта своеасаблівы псіхалагічны суіцыд, які зацягнуўся ў часе. Пачуццё віны канструктыўнае, калі яно кароткачасовае і калі ты маеш магчымасць выправіць сваю памылку. У астатнім яно шкоднае і можа прывесці да псіхасаматыкі, праблем са здароўем.

## Пра кавалачак лёду і гром сярод яснага неба

***— Як перажыць смерць мужа (жонкі) у сталым узросце?***

— Калі жанчына ці мужчына застаецца ў адзіноце, але іх увагу пераключаюць на сябе дзеці, унукі, гэта ідэальны варыянт — такая дапамога самая прадукцыйная. Калі няма дзяцей альбо яны далёка, многім перажыць страту дапамагае царква, духоўныя практыкі. Мае бацькі пражылі разам 50 гадоў. Тата, на жаль, не змог справіцца са сваім горам. Ён перажыў маму толькі на два гады. Зараз я разумею, што ён увесь свой боль трымаў у сабе. Не паказваў нам, дзецям, што перажывае, і ў яго развілася анкалогія. На той момант я, на жаль, не ведала, што ў нас у Мінску ёсць «Універсітэт трэцяга ўзросту», дзе блізкія па духу пажылыя людзі збіраюцца разам, чаму-небудзь навучаюцца. Сёння гэта выратаванне для тых, хто застаўся адзін у сталым узросце.

***— Некаторыя людзі не ведаюць, што сказаць знаёмым, якія страцілі блізкага. Якая падтрымка насамрэч ім патрэбная?***

— Няма дакладнай схемы дапамогі. Некаму трэба выгаварыцца, іншаму — проста прыхіліцца і паплакаць на чыімсьці плячы. Камусьці ж патрэбна цішыня, проста пабыць аднаму. Калі сышоў Саша, мне не трэба было нічыіх слоў, яны мне замінялі, я была ўнутры сябе, я проста з ім развітвалася. У чалавека гора, у гэты момант вельмі важна быць чулым да яго стану. Калі не ведаеце, што сказаць, лепш нічога не кажыце. Чым прамаўляць шаблонныя агульнапрынятыя фразы, лепш проста быць побач. І вы самі ў працэсе адчуеце, якая дапамога патрэбна. Я была на пахаванні знаёмай. Яе дачка стаяла як каменная і глядзела, як апускаецца труна. Пад уздзеяннем нейкага інтуітыўнага адчування муж, з якім яны ўжо даўно былі ў разводзе, падышоў, стаў ззаду і проста ўзяў яе дзвюма рукамі за плечы. У гэты момант жанчына асунулася на яго, ёй якраз тое патрэбна было. Часам вельмі важна проста прынесці чаю, даць насоўку, пакласці кавалачак лёду ў далонь. Калі чалавека трасе, накінуць хустку на плечы. Адназначна не варта казаць фразы накшталт «Нічога страшнага, справімся» ці «Хопіць аб гэтым размаўляць». Тым самым вы абясцэньваеце чужыя пачуцці. І я не па чутках ведаю, як гэта балюча. Калі я на працы дзялілася адчуваннем ад сыходу мамы, мне калега сказала: «Ну што ты накручваеш сябе. Хопіць ужо пра гэта гаварыць». Прайшло шмат гадоў, але мне зусім не хочацца нічым дзяліцца з гэтым чалавекам.

**«Важна разумець: што б ні здарылася, з якімі б выпрабаваннямі мы ні сутыкнуліся, жыццё працягваецца. Таму трэба падумаць пра сябе, пра сваіх блізкіх».**

***— Бабуля Анюта, мая суседка, часта паўтарае: «Схаджу на магілку, пагавару з сынам. Ад гэтага мне лягчэй становіцца».***

— Боль вельмі небяспечна трымаць у сабе, яго трэба выгаварыць, выплакаць, выкрычаць... Таму, калі сапраўды хочаце дапамагчы, падтрымлівайце размовы аб страце. Будзьце пры гэтым цярплівымі, не перабівайце і не спыняйце.

***— Як дапамагчы дзіцяці перажыць страту бабулі ці кагосьці з бацькоў?***

— Тут нельга даваць агульнай рэкамендацыі. Гэта небяспечна. Бо кожнае дзіця — унікальнае сузор'е якасцяў, усё залежыць ад узросту, ад таго, наколькі была вялікая сувязь, ад тыпу нервовай сістэмы. У 2-3 гады самае бяспечнае — не акцэнтаваць увагу на сыходзе. Па меры сталення, калі эмацыянальныя сувязі становяцца больш моцнымі, можа спатрэбіцца і дапамога псіхолага. Скажу адно: успрыманне дзіцем смерці ў многім залежыць ад паводзін дарослых. Калі мама рэагуе спакойна, што б ні адбывалася, — сто працэнтаў, што і дзіця будзе спакойным. На YouTube ёсць кароткі відэаролік, там жанчына стаіць каля акна і трымае малечу на руках. На вуліцы пачынаецца навальніца, грыміць гром. Дзіця ўстрывожана паварочвае галаву, глядзіць на маму, як быццам пытаецца: «Ты баішся?» — «Не, не баюся, гэта проста гром», — кажа мама. Дзіця супакойваецца. Неўзабаве зноў грыміць. Малы зноў глядзіць устрывожана на маму. Яна яму ўсміхаецца і кажа: «Гэта проста гром». Я ў захапленні ад гэтай жанчыны. Пабольш бы такіх мам і татаў, тады за псіхалагічны стан нашых дзяцей можна было б не баяцца.

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**

## ШТО МОЖА ДАПАМАГЧЫ СПРАВІЦЦА СА СТРАТАЙ?

***ДАПАМОГА ІНШЫМ.*** Яна напаўняе жыццё новым сэнсам. Ведаю шмат жанчын, якія ствараюць дабрачынныя фонды, звязаныя з захворваннем, з-за якога памерла дзіця. Хтосьці дапамагае анкахворым дзеткам. А хтосьці, як мама, у якой здарыўся выкідыш, пачала шыць чахлы на кювезы і вязаць васьміножак для неданошаных немаўлят. Нярэдка людзі, якія страчваюць блізкіх, становяцца валанцёрамі і дапамагаюць бяздомным жывёлам.

***НАПІСАННЕ ПІСЬМА.*** Трэба апісаць сваё гора на паперы, пастарацца паглядзець на яго вачыма іншых. Для прапрацоўкі пачуцця віны вельмі эфектыўная рытуальная псіхалагічная тэхніка. Яе Таццяна Шаранда часта рэкамендуе сваім кліентам. Кажа, што прымяняла яе і сама пасля смерці мамы. «Ставіла перад сабой яе фота, запальвала свечку, абхоплівала рукамі слоік з вадой і расказвала аб сваім болю: «Мам, ты мяне прабач, што я прапусціла тваю хваробу. Я вельмі пакутую, што не дапамагла табе...» Наступае дзень, калі ты трымаеш слоік і разумееш, што больш няма чаго казаць. І на душы становіцца лягчэй».

***ПАЛОМНІЦКІЯ ПАЕЗДКІ.*** Ты з'язджаеш з месца, дзе ўсё вакол нагадвае аб памерлым, хоць на кароткі час, дакранаешся да чагосьці старажытнага, рэлігійнага.

***РЫТУАЛЫ І ВЕРА.*** Усе рытуалы створаныя ў тым ліку для таго, каб дапамагчы, аблегчыць боль ад страты блізкага чалавека. Імя ў запісцы аб спачыне, запаленая свечка — гэта праяўленне любові да таго, каго ўжо няма побач фізічна, але хто назаўсёды застанецца ў душы. А любоў — адзінае, што выратоўвае нас у гэтым жыцці. Вельмі дапамагае вера. Маецца на ўвазе сапраўдная вера. Гэта калі ты прымаеш усё, што адбываецца ў тваім жыцці, як дадзенасць, няхай і балюча, і цяжка. Калі цалкам давяраеш Богу. Мы ж ніколі не ведаем, чаму нешта адбываецца так ці інакш.

Дробязі (асабістага) жыцця

# Сэрца жанчыны, як акіян

## ДЛЯ ТЫХ, КАМУ ЗА...

Галіне Іванаўне, паводле яе уласных слоў, шэсцьдзесят «з хвосцікам». (Памеры «хвосціка» не ўдакладняюцца.) А вось тыя, хто добра яе ведае, сцвярджаюць, што ўсе семдзесят, калі не больш. Галіна Іванаўна «перажыла» траіх афіцыйных мужоў. Першы, аднойчы заспеўшы жонку з маладым суседам, у хуткім часе (напэўна, з гора) адбыў на зямлю «абетаваную», прыхапіўшы з сабой сакратарку з працы... Другі заўчасна памёр ад сардэчнага прыступу на ўласных градах. Ад трэцяга Галіна сама збегла, патлумачыўшы сяброўкам, што ён «не цягне». Інакш кажучы, не адпавядае яе патрабаванням як жанчыны. Сяброўкі спрабавалі дапытацца, як менавіта трэба «цягнуць», каб дабіцца гэтай адпаведнасці, ды так нічога з Галіны не выцягнулі.

Застаўшыся без «мужчынскага суправаджэння», Галіна Іванаўна не страціла баявога духу, узяўшы на ўзбраенне фразу з вядомага савецкага кінафільма: не нарадзіся прыгожай, а нарадзіся актыўнай. Гэта актыўнасць аднойчы прывяла яе ў мясцовы Палац культуры на вечар «для тых, каму за...» Галіна пайшла, бо ў аб'яве не ўдакладнялася, наколькі «за...» І мерапрыемства ёй спадабалася. Там танцавалі тое, што яна добра ўмела: полечку, вальс... І кавалеры былі ўсе як на падбор: у касцюмах, пры гальштуках, з начышчанымі чаравікамі... Яна схадзіла на адзін вечар, на другі, на трэці... Потым і ўвогуле зрабілася заўсёднiцай, адплясвала так, што нават маладзейшыя зайздросцілі. Ну і, безумоўна, знаёмілася з патэнцыяльнымі прэтэндэнтамі ў спадарожнікі. У выніку выбрала... дваіх. Як казала сама, «аднаго — для кахання, другога — для работы». Той, што «для кахання», — Міхаіл Сцяпанавіч, прыгожы, статны мужчына з густой шавялюрай, былы выкладчык універсітэта — прыходзіў да яе раз на тыдзень-два, па серадах. У выхадныя ніколі не наведваўся, бо па суботах да яго прыязджалі дачка з унукамі і заставаліся начаваць... Той, што «для работы», — Ігар Міхайлавіч, невысокі, хударлявы, лысаваты, былы праараб-будаўнік — днямі візітаў, наадварот, абраў выхадныя, што, як вы разумееце, Галіну Іванаўну цалкам задавальняла. З дапамогай Ігара Міхайлавіча яна распачала рамонт сваёй двухпакаёўкі: пераклеіла шпалеры, памяняла плітку ў санвузле, перасцяліла падлогу на кухні... Што Галіна рабіла з дапамогай Міхаіла Сцяпанавіча, гісторыя замоўчвае, але адмяняць «серады» яна дакладна не збіралася. Наадварот, дзякуючы ім квітнела і пахла. І хвалілася суседзям і знаёмым, што ўсё ў яе складваецца цудоўна, што вось толькі цяпер яна «жыць пачала»...

Невядома, колькі б працягвалася гэта ідылія, але ў адну з субот дачка Міхаіла Сцяпанавіча па нейкай прычыне вырашыла адмяніць свой прыезд, а ён, у сваю чаргу, захацеў зрабіць сюрпрыз Галіне Іванаўне. І зрабіў, заспеўшы ў яе кватэры ў восем гадзін вечара незнаёмага хударлявага мужчыну ў трэніках і майцы, з пэндзлем у руках. Усе спробы Галіны Іванаўны растлумачыць, што проста рабочы, які рамантуе кухню, затрымаўся па справах, толькі падлілі масла ў агонь. Тут ужо і Ігар Міхайлавіч пакрыўдзіўся: маўляў, чамусьці ва ўсе іншыя суботы я быў не проста рабочым, а тут дык адразу ім стаў?!

Словам, ідылія скончылася. Крыху паперажываўшы, Галіна Іванаўна зноў вярнулася да таго, з чаго пачынала: вечары «для тых, каму за...» у Палацы культуры нiхто не адмяняў. «А што рабіць? — уздыхае яна. — Распачаты рамонт у кватэры некаму ж трэба заканчваць!»

І з гэтым не паспрачаешся...

## ВОСЬ І ЗРАЗУМЕЙ!

Адной маёй знаёмай (назавём яе Жаннай) казачна пашанцавала. Праўда, сам факт шанцавання яна прызнала значна пазней. А спачатку проста выскачыла замуж на трэцім курсе медуніверсітэта за звычайнага хлопца з паралельнага факультэта. Хоць ён і тады быў не з апошняга дзясятка — займаўся бегам і плаваннем, кідаў ці то кап'ё, ці то ядро, яшчэ і вучыцца паспяваў амаль на «выдатна». Ажаніўшыся, ён стаў узорным сем'янінам, ну проста з вялікай літары «с». Атрымаў другую вышэйшую адукацыю, пабудаваў кватэру з усялякімі «наваротамі», за лічаныя гады адолеў некалькі кар'ерных прыступак... Жанет нарадзіла яму дваіх дзяцей, з якімі ён няньчыўся нароўні з ёю, а можа, і больш. Яго жыццё засяродзілася на двух момантах — доме і працы, прычым першаму ён аддаваў ніколькі не менш увагі і праз трыццаць гадоў сумеснага жыцця. За гэты час не было ніводнага выпадку, каб бацька сямейства затрымаўся дзе-небудзь не па справе. Піва з сябрамі? Крый божа!.. За ўсе гады жыцця — ніводнай нагоды для рэўнасці, ніякіх пабочных імёнаў у запісных кніжках, ніякіх «левых» званкоў па мабільным... Па выхадных ён закупляе ў гіпермаркеце прадукты на тыдзень, а, вярнуўшыся дадому, прасуе ім жа памытыя кашулі. Словам, казка, а не мужчына. І я не стала б так падрабязна засяроджваць на ім увагу, калі б не адзін выпадак... Сустрэла неяк сваю суседку па пад'ездзе Людмілу, якая таксама добра ведае Жанет. Слова за слова, і раптам яна пытаецца:

— Ну як там наша Жанка? Яшчэ жыве са сваім занудам? Бедная... Я на трэці дзень пасля вяселля застрэлілася б!

Вось і зразумей пасля гэтага жанчыну. Што, уласна кажучы, ёй трэба? А можа, гэта элементарная зайздрасць? Людміла адразу абвяргае падазрэнні.

— Ведаеш, як мой Шурык аднойчы хадзіў дыванок выбіваць? Днём у суботу пайшоў, а раніцай у панядзелак вярнуўся. Я якраз блінчыкі на сняданак смажыла, патэльню ў руцэ трымала... І гэтай патэльняй яму па лысіне — трах! — расказвае яна, а ў голасе такое замілаванне, такі гонар непрыхаваны!.. Людміла і цяпер чакае мужа. Бо аднойчы ён выйшаў чарговы раз са сваім дыванком, і больш не вярнуўся. Не, нічога дрэннага з ім не здарылася. Калі, безумоўна, не лічыць «прызямлення» ў іншай кватэры іншага дома, дзе пражывала іншая жанчына з двума дзецьмі. Трэцяе нарадзілася ў яе ўжо ад Шурыка, але гэта акалічнасць Людмілу чамусьці не бянтэжыць. Ёй у сямейным жыцці хочацца змены падзей і фарбаў. Лёгкага вар'яцтва. Маленькай непрадказальнасці. Драйву. Як у герояў амерыканскага фільма «Містар і місіс Сміт». Яна, зразумела, не Анджэліна Джалі, але ад шчырасці і аднастайнасці стамляецца не менш. Тут ужо і да размахвання патэльняй недалёка. Сапраўды, чым не спосаб для стымуляцыі сямейнага тонусу?

## ЗА ВЫНАХОДЛІВАСЦЬ!

На ваш погляд, якія якасці неабходныя сапраўднаму мужчыну? Правільны адказ — кемлівасць і стрыманасць. Без іх — нікуды, без іх ні адзін адзюльтэр (пазашлюбная сувязь) не вытрымае праверку рознымі жыццёвымі выпрабаваннямі. А выпрабаванні падсцерагаюць аматараў легкадумных сувязяў на кожным кроку. І тут галоўнае што? Правільна, не разгубіцца.

Адзін мужчына (назавём яго Адналюбаў) сказаў жонцы, што камандзіраваны ў Прагу. І, што цікава, менавіта туды ён і паехаў. Але не ў камандзіроўку, а на адпачынак з юнай сяброўкай. Калі надышоў час вяртацца дадому, аматар любоўных прыгод паўночы правёў, інспектуючы змесціва свайго чамадана і ліквідуючы ўсе намёкі на жаночую прысутнасць (доўгія валасы ў складках адзення, плямкі ад губной памады, пах жаночага парфуму і г. д.). Скончыўшы справу, наш вынаходнік застаўся вельмі задаволены сабой: прычапіцца не было да чаго. У стратэгічна важным месцы чамадана ляжаў нават прыхоплены з дому тэкст выступлення на англійскай мове — доказ напружанай працы ў камандзіроўцы.

Ужо ў аэрапорце ім паведамілі, што рэйс затрымліваецца на восем гадзін. Аднак гэта не засмуціла парачку — не доўга думаючы, яны знялі нумар у невялікім атэлі непадалёку, дзе і правялі дадаткова адведзены лёсам час.

...Дома Адналюбаў расцалаваў жонку, уручыў ёй падарункі, дэманстратыўна дазволіўшы распакаваць чамадан (даклад на англійскай мове ляжаў з самага верху). Потым была сумесная вячэра і звычайнае ў такіх выпадках пытанне жонкі: «Памыць штонебудзь трэба?» Вырашылі, што ў мыцці маюць патрэбу джынсы, у якіх прыбыў муж. «А ты з кішэняў усё дастаў?» — спытала жонка і для ўпэўненасці патрэсла штаны. З кішэні вылецела нейкая паперка. Адналюбаў віртуозна падхапіў яе, хуценька скамечыў і зацiснуў у далоні.



«Што гэта?» — пацікавілася жонка. — «А гэта квітанцыя з той крамы, дзе я табе залаты ланцужок з кулонам купляў. Не хачу, каб ты ведала, колькі ён каштаваў!» — усміхнуўся вынаходлівы муж і пяшчотна пацалаваў у шчочку сваю даверлівую палову.

У руках нашага героя ў гэты момант сапраўды знаходзілася квітанцыя, але не з крамы, а з атэля, дзе ён правёў апошнія некалькі гадзін «камандзіроўкі». Мужчына нават не памятаў, у які момант яму далі гэту квітанцыю, як ён засунуў яе ў кішэню джынсаў, і ўжо тым больш не заўважыў, што там было напісана. А напісана было наступнае: «Атэль (назва атэля). Пакой (нумар пакоя). Тэрмін пражывання (колькасць гадзін). Колькасць пражываючых (два чалавекі, м-р Адналюбаў і м-с Адналюбава)».

...Дарэчы, тую юную сяброўку наш герой ужо забыў, як звалі, а залаты ланцужок з кулонам яго жонка з задавальненнем носіць да гэтага часу.

## АДНОЙЧЫ Ў ПАДЗЕМНЫМ ПЕРАХОДЗЕ

Падвечар у падземным пераходзе на плошчы Перамогі заўсёды натоўп. Групкамі ці паасобку людзі снуюць туды-сюды, усім сваім выглядам абвяшчаючы свету пра заканчэнне працоўнага дня... У каго — заканчэнне, а ў каго — пачатак. Насупраць аднаго з выхадаў заняў месца хлопец з гітарай. Ён відавочна хвалюецца — вядомая блюзавая кампазіцыя з рэпертуару Гэры Мура даецца яму з цяжкасцю, на высокіх нотах голас дрыжыць і зрываецца. Хлопец не здаецца і працягвае спяваць з упартасцю двоечніка, які не вывучыў урок, але хоча даказаць настаўніку адваротнае.

Лезу ў сумку, каб дастаць з кашалька драбязу і пакласці яму ў капялюш — выключна з-за пачуцця павагі да Гэры Мура і спачування невядомаму выканаўцу. Нават здалёк відаць, як ад напружання і хвалявання ў яго падгінаюцца калені...

І тут з натоўпу нечакана выныравае дзяўчына — худзенькі завостраны тварык амаль без касметыкі, доўгія валасы, сабраныя ў хвосцік, а ў вачах — смутак сусвету...

— Прабачце, можна да вас звярнуцца?

Разумею, што пытанне мае непасрэднае дачыненне да мяне. І гэтак жа выразна адчуваю, што далей прагучыць просьба: даць беднай дзяўчыне крыху грошай (не хапае на праезд, абед у сталовай, марожанае...) Але думкі раптам пачынаюць блытацца: у руках дзяўчыны заўважаю пяцірублёвую паперку, якую яна... чамусьці працягвае мне.

— Я вас прашу, зрабіце ласку! — чуваць, што дзяўчына хвалюецца. — Пакладзіце гэтыя грошы ў капялюш вунь таму гітарысту! — яна паказвае ў бок не вельмі ўдалага прыхільніка творчасці Гэры Мура.

— Дык гэта ваш? — удакладняю.

— Ну, так, — дзяўчына разгублена ўсміхаецца. — Разумееце, гэта яго першае выступленне на публіцы, ён сёння паўночы не спаў, рыхтаваўся, суседзі ў сценку грукалі... Вы не думайце, ён таленавіты. І добры. Хоча мне падарунак на дзень нараджэння зрабіць — новы тэлефон, а стыпендыі не хапае. Я яго, канешне, адгаворваю, але ён ні ў якую: маўляў, буду іграць у пераходзе, зараблю грошы і здзейсню тваю мару... Рамантык няшчасны! Я з ім сюды прыйшла, бо ведаю, як неахвотна сёння людзі з грашамі расстаюцца. Сто рублёў са сваёй стыпендыі ўзяла, на драбязу разменяла — па рублі, па два, па пяць, каб людзям раздаць. Ён пра гэта, безумоўна, не ведае, інакш не дараваў бы. А я шчыра хачу дапамагчы... Дык што, возьмеце грошы?

— Не, — кажу і адводжу ў бок яе руку з пяцірублёўкай. Адкрываю сумку, дастаю адтуль аналагічную купюру і рашуча крочу ў бок музыканта. Кладу грошы ў капялюш і... са здзіўленнем заўважаю там россып адна- і двухрублёвых манетак. Цудоўна разумеючы, што дзяўчына, з якой я толькі што размаўляла, проста фізічна не змагла б за гэты час далучыцца да сваёй «высакароднай аферы» такую колькасць людзей, прыходжу да высновы, што ў капелюшы знаходзяцца сапраўдныя грашовыя ахвяраванні прахожых.

Значыць, тая дзяўчына можа спаць спакойна: на новы тэлефон хлопец, зразумела, не заробіць, затое маральнае задавальненне атрымае. А яна будзе шчаслівая ад таго, што шчаслівы ён.

Напэўна, гэта і ёсць каханне...

**Наталля УЛАДЗІМІРАВА.**

## ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества ОАО «Автотрансстрой»

| Лот | Наименование | Начальная цена с учетом НДС 20 %, бел. руб. | Задаток, бел. руб. | Шаг аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Мерник образ. М2Р-50, инв. № 1026 | 5,04 | 0,50 | 0,25 |
| 2 | Станок ЗК-633, инв. № 1040 | 111,60 | 11,16 | 5,58 |
| 3 | Пресс-ножницы, инв. №756 | 612,00 | 61,20 | 30,60 |
| 4 | Сварочный агрегат, инв. № 1082 | 52,20 | 5,22 | 2,61 |
| 5 | Сварочный агрегат, инв. № 1082а | 52,20 | 5,22 | 2,61 |
| 6 | Сварочный агрегат, инв. № 1082б | 52,20 | 5,22 | 2,61 |
| 7 | Установка д/дерев. 924Д | 356,40 | 35,64 | 17,82 |
| 8 | Тележка Э-307 | 14,04 | 1,40 | 0,70 |
| 9 | Электровулканизатор ОМЗ-48 | 1620,00 | 162,00 | 81,00 |
| 10 | Бензоколонка КР-500.25 | 507,60 | 50,76 | 25,38 |
| 11 | Бензоколонка КР-500.25 | 507,60 | 50,76 | 25,38 |
| 12 | Бензоколонка КЭР-50 | 507,60 | 50,76 | 25,38 |
| 13 | Стенд Р-640 | 270,00 | 27,00 | 13,50 |
| 14 | Пневмостенд для клепки ПДК-1 | 183,60 | 18,36 | 9,18 |
| 15 | Стенд 532-2М | 1404,00 | 140,40 | 70,20 |
| 16 | Стенд КН-968 | 1404,00 | 140,40 | 70,20 |
| 17 | Стенд КИ-921 | 1512,00 | 151,20 | 75,60 |
| 18 | Стенд Р-776 | 1728,00 | 172,80 | 86,40 |
| 19 | Теплосчетчик ТЭМ-05М-2 dy80/80 N25693 ПРП1.ПРП2.ТСП-Н. | 216,00 | 21,60 | 10,80 |
| 20 | Диагностическое оборудование АБИТ.3555411.001. Адаптеры | 151,20 | 15,12 | 7,56 |
| 21 | Стеллаж и коробка к стеллажу | 129,60 | 12,96 | 6,48 |
| 22 | Доска необрезная | 118,80 | 11,88 | 5,94 |
| 23 | КПП б/у | 540,00 | 54,00 | 27,00 |
| 24 | Кабина б/у (МАЗ 551605-271) | 2808,00 | 280,80 | 140,40 |
| 25 | Кард. вал б/у 500 | 226,80 | 22,68 | 11,34 |
| 26 | Кард. вал б/у МАЗ 5516 среднего моста | 84,24 | 8,42 | 4,21 |
| 27 | Кузов б/у МАЗ 5516 | 2376,00 | 237,60 | 118,80 |
| 28 | Мост передний б/у | 702,00 | 70,20 | 35,10 |
| 29 | П/мост МАЗ б/у | 702,00 | 70,20 | 35,10 |
| 30 | П/мост б/у | 3510,00 | 351,00 | 175,50 |
| 31 | Подъемник б/у | 43,20 | 4,32 | 2,16 |
| 32 | Седло б/у | 1252,80 | 125,28 | 62,64 |
| 33 | Энергоаккумулятор б/у | 60,48 | 6,05 | 3,02 |
| 34 | Кирки; 236-1601138 накладка сцепл.; 236-1601138 накладка сцепл. | 41,47 | 4,15 | 2,07 |
| 35 | Лампа люм 36w (58w, 65w); лампа люм 36w (58w, 65w) | 24,30 | 2,43 | 1,22 |
| 36 | Ствол ТСБ пож; 1109574 чехол фильтра; 1112024 корпус форсунки; 1112150 штуцер; 1702035 сухарь; 1721252 кольцо; 1721334 кольцо; 2918184 чашка; 864180 манжета; клапан; кольцо стоп. 400468 | 74,20 | 7,42 | 3,71 |
| 37 | Баллон кислородный, 6 шт. | 403,20 | 40,32 | 20,16 |
| 38 | Диск колесный б\у 5 шт. | 60,00 | 6,00 | 3,00 |
| 39 | Мост задний МАЗ-543208, 4 шт. | 1392,00 | 139,20 | 69,60 |
| 40 | Мост задний маз 5516 круглый редуктор, 1 шт. | 300,00 | 30,00 | 15,00 |
| 41 | Мост задний МАЗ 54323, 1 шт. | 348,00 | 34,80 | 17,40 |

В отношении лота № 1 проводятся одиннадцатые повторные торги. **Стоимость снижена на 99 %.** Ранее публикация размещалась в газете «Звязда» № 117 (29739) от 17.06.2022, стр. 14, № 144 (29766) от 26.07.2022, стр. 6, № 160 (29782) от 17.08.2022, № 176 (29798) от 08.09.2022, стр. 6, № 193 (29815) от 01.10.2022, стр. 14, № 213 (29835) от 29.10.2022, стр. 15, № 229 (29851) от 22.11.2022, стр. 10, № 245 (29867) от 14.12.2022, стр. 14, № 1 (29881) от 04.01.2023, стр. 12, № 14 (29894) от 24.01.2023, стр. 6, № 53 (29933) от 21.03.2023, стр. 6. В отношении лотов №№ 2-6 проводятся восьмые повторные торги. **Стоимость снижена на 85 %.** Ранее публикация размещалась в газете «Звязда» № 165 (29787) от 24.08.2022, стр. 14, № 193 (29815) от 01.10.2022, стр. 14, № 213 (29835) от 29.10.2022, стр. 15, № 229 (29851) от 22.11.2022, стр. 10, № 245 (29867) от 14.12.2022, стр. 14, № 1 (29881) от 04.01.2023, стр. 12, № 14 (29894) от 24.01.2023, стр. 6, № 53 (29933) от 21.03.2023, стр. 6. В отношении Лотов №№ 7-36 проводятся первые повторные торги. **Стоимость снижена на 10%.** Ранее публикация размещалась в газете «Звязда» № 53 (29933) от 21.03.2023, стр. 6. В отношении лотов № 37-41 проводятся первые торги.

**Местонахождение лотов №№ 1-41:**
**Минская обл., г. Молодечно, ул. Тамары Дудко, 2**

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения торгов** | В отношении лотов 1-36: **18 мая 2023 года в 12.00 (регистрация с 11.30 до 11.55)** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127 |
| | В отношении лотов 37-41: **6 июня 2023 года в 12.00 (регистрация с 11.30 до 11.55)** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127 |
| **Срок приема заявлений и внесения суммы задатка** | В отношении лотов 1-36: с 10.00 04 мая 2023 года до 16.00 16 мая 2023 года |
| | В отношении лотов 37-41: с 10.00 04 мая 2023 года до 16.00 02 июня 2023 года |

**Условия для участия в торгах:**

1. До подачи заявления необходимо внести задаток на р/с **BY36ALFA30122215570040270000**, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: OTHR 40901, Задаток для участия в торгах по Лоту __, ОАО «Автотрансстрой», проводимых ___._____.2023.
2. Заявление на участие (на каждый лот – отдельное) и необходимые документы (соглашение о правах и обязанностях сторон в 2-х экземплярах (на каждый лот – отдельное), копия платежного поручения о перечислении задатка, копия паспорта (стр. 31-33, действующая прописка); копия свидетельства о государственной регистрации – для ИП и юр. лица; документ, подтверждающий полномочия руководителя или представителя юр. лица, копия Устава – для юр. лица) принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127. Документы могут подаваться посредством направления почтой (220113, г. Минск, а/я 524) или личной подачи. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата и время получения организатором торгов оригинала заявления на участие в аукционе и полного пакета прилагаемых документов (в случае направления почтой – дата и время поступления документов на абонентский ящик организатора торгов).
3. К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении о проведении торгов срок заявление с приложением необходимых документов и зарегистрированные в журнале регистрации на участие в торгах. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов.
4. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона.
5. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона (вознаграждение аукциониста и затраты по размещению публикации в газете) на основании счета-фактуры и акта в течение 5 (пяти) календарных дней со дня проведения аукциона. **Вознаграждение аукциониста – 7 % от конечной цены предмета торгов.** Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен подписать с Продавцом договор купли-продажи предмета торгов после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона в течение 10 (десяти) рабочих дней с момента подписания протокола о результатах торгов. Оплата приобретенного предмета торгов должна быть произведена в полном объеме не позднее 15 (пятнадцати) рабочих дней со дня проведения торгов.
6. Подробнее с правилами проведения торгов можно ознакомиться в разделе «Ликвидация» на сайте: https://orgtorg.by/info/.
7. Все желающие могут предварительно ознакомиться с предметом торгов. Контактное лицо для осмотра предмета торгов **– Александр Николаевич, +375292627504.**
8. Организация и проведение аукциона осуществляется на основании норм положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16

| | |
|---|---|
| **Информация о продавце** | **ОАО «Автотрансстрой» в лице ликвидатора – ООО «Центр антикризисных проектов», тел.: 80172552928; +375293489225 (Минская обл., г. Молодечно, ул. Тамары Дудко, д. 2, УНП 600077182)** |
| **Организатор аукциона** | **ООО «Фрондера» 220113, г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127: ☎ 8 (029) 308 28 97 • e-mail: info.torgi@orgtorg.by • сайт https://orgtorg.by • telegram https://t.me/orgtorg** |

## ИЗВЕЩЕНИЕ
